ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 123 (4027)
НЯДЗЕЛЯ, 10 МАЯ
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
ШЭСЬПЕРАПЫННА

Расстрэл першамайскіх дэманстрацый у Любартове

ВАРШАВА, 8. Паводле дадатковых вестак, расстрэл першамайскай дэманстрацыі ў Любартове быў падрыхтаваны мясцовымі ўладамі. На дарогах у Любартова была НАЛАДЖАНА ПАЛІЦЭЙСКАЯ ЗАСАДА. Паліцэйснія втрымалі загад не прапускаць дэманстрантаў у горад. У дэманстрацыі прымала ўдзел БОЛЬШ 5-ці ТЫСЯЧ СЯЛЯН І РАБОЧЫХ мясцовых фабрык і заводаў.

Крывавыя сутычкі адбыліся на адлегласьці 3-х кілёмэтраў ад Любартова — па дарозе ад вядомага цэмэнтнага заводу Сірлей. З раніцы 1 мая паліцэйская засада разагнала дэманстрацыю ў 300-500 сялян, але ўсьлед за першай падышла новая дэманстрацыя, у якой прымала ўдзел каля 4-х ТЫСЯЧ РАБОЧЫХ і сялян. Спробы паліцыі разагнаць дэманстрантаў аказаліся дарэмнымі. ПАЛОВА ПАЛІЦЭЙСКАГА АТРАДУ БЫЛА ДЭМАНСТРАНТАМІ РАЗБРОЕНА, астатнія ўцякалі, але затым сталі ЗАЛПАМІ СТРАЛЯЦЬ У НАТОЎП. ТРОЕ ДЭМАНСТРАНТАЎ, У ТЫМ ЛІКУ СЬЦЯГАНОСЕЦ, БЫЛІ ЗАБІТЫ. Пасьля гэтага было выклікана паліцэйскае падмацаваньне з Любліна. Сутычкі з дэманстрантамі, якія набліжаліся да гораду па ўсіх дарогах, працягваліся амаль цэлы дзень.

Паліцэйскае падмацаваньне, якое прыбыло з Любліна, да гэтага часу яшчэ ня выехала з Любартова, ператварыўшыўся ў сапраўдную КАРНУЮ ЭКСПЭДЫЦЫЮ. ПА ЎСІХ ВЁСКАХ АДБЫВАЮЦЦА МАСАВЫЯ ВОБЫСКІ І АРЫШТЫ.

Вышэй тэмпы работы на транспарце

Правільнасьць генэральнай лініі партыі забясьпечыла пасьпяховае ажыцьцяўленьне пяцігодкі за чатыры гады, а па радзе галін народнай гаспадаркі — за 2½—3 гады. Толькі ў бягучым годзе крайна атрымае новых 518 прамысловых прадпрыемстваў, 1040 МТС, будзе калектывізавана 50 проц. сельскай гаспадаркі. Наперакор апартуністам, ныцікам, маверам — здрадніцкам справы Кастрычніка,—пераможным, цьвёрдым крокам, намаганьнямі мільённых мас рабочай клясы і працоўных, пад кіраўніцтвам партыі Леніна пасоўваецца наперад справа будаўніцтва сацыялізму.

Сур'ёзнай перашкодай на шляху далейшага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва пагражаў стаць ЧЫГУНАЧНЫ ТРАНСПАРТ. Бурны рост усіх галін народнай гаспадаркі прад'явіў значна павышаныя патрабаваньні да транспарту, паставіў перад ім рад вялізарных задач. Транспарт адстаў ад агульных тэмпаў будаўніцтва, стаў «вузкім» месцам у народнай гаспадарцы. Вось чаму партыя і ўрад сваёй гістарычнай адозвай ад 15 студзеня заклікалі пралетарыят падцягнуць тэты адсталы вучастак фронту, сапьшавіцкімі тэмпамі ліквідаваць прарывы, аздараўіць транспарт, разгарнуць сацыялістычную рэканструкцыю яго. Адозва выклікала вялікі ўздым творчага энтузіязму мільёнаў. Ня толькі чыгуначнікі, але і ўвесь пралетарыят, уключыўся ў барацьбу за падцягненьне транспарту да перадавых галін народнай гаспадаркі. Суботнікі, штурмы, рост сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва (2534 новых ударніка)—вось канкрэтны адказ пралетарыяту на заклік партыі і ўраду.

З часу абвяшчэньня адозвы прайшло амаль 4 месяцы. За гэты пэрыяд можна канстатаваць рад ДАСЯГНЕНЬНЯЎ у рабоце транспарту. Павялічыліся тэхнічная і камэрцыйная хуткасьць цягнікоў, сярэдняя-сутачная пагрузка, зьменшыўся лік выпадкаў непадачы парадоў пад цягнікі і г. д.

Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы рэалізацыі адозвы ЦК і СНК аб ЛІКВІДАЦЫІ АБЯЗЬЛІЧКІ НА ПАРАВОЗЕ. Паравозная гаспадарка—асноўнае зьвяно аздараўленьня транспарту. Ліквідацыя абязьлічкі на паравозе, пераход на спараную даў відавочны эфэкт. Аднак, як і адзначыў III Усебеларускі зьезд чыгуначнікаў, які адбыўся гэтымі днямі, дасягненьні гэтыя яўна невыстарчальныя, яны даюць толькі зрух, але КАРЭННАГА ПЕРАЛОМУ Ў РАБОЦЕ ЧЫГУНКІ ЯШЧЭ НЯМА. Процант хворых паравозаў усё яшчэ застаецца высокім, пагрузка не дасягае нормы, значны непрадукцыйны прастой вагонаў і г. д.

Спаранае яшчэ ня ўсюды замацавана. Апартуністычнае супраціўленьне, нераспарадчасьць, няўменьне правільна паставіць справу, арганізаваць сыстэму выкліку брыгад—вось прычыны значных зрываў спаранай. Такое становішча, калі за адну пяцідзеўку паўтараецца 15 зрываў спаранай (ЖЛОБІН), ня можа быць цярпіма. Зусім правільна III УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ЧЫГУНАЧНІКАЎ патрабаваў сурова пакараць вінаватых за зрыў спаранай.

Бідаўнасьць карысьці ад ліквідацыі абязьлічкі У ЯЗЬДЗЕ выклікала адначасова масавы рух за ліквідацыю абязьлічкі ВА УСІХ ЗЬВЕНЬНЯХ ТРАНСПАРТУ. Гэта дыктуецца неабходнасьцю ўстанаўленьня цьвёрдай адказнасьці кожнага работніка транспарту за работу, якую ён выконвае, правільнай арганізацыяй працы, узьнімцьця працоўнай дысцыпліны. «Зьвязда» ня раз ставіла аб гэтым пытаньне. Яна паказвала на бліскучы вопыт ст. Ліскі, якая ліквідавала абязьлічку ва ўсёй рабоце на транспарце. Дзе пераняў гэты вопыт? На ст. ВОРША патрабаваньне рабочых-чыгуначнікаў ліквідаваць абязьлічку ў рабоце наткнулася на сьцяну бюракратычнага кансэрватызму. Чыгуначныя чыноўнікі ніяк ня могуць перайсьці на новыя мэтады работы, раз няма на гэта дырэктыў...

Толькі падзвычай слабай перабудовай работы чыгуначных арганізацый можна тлумачыць ігнараваньне лепшых вопытаў арганізацыі працы. Толькі гэтым можна і тлумачыць тое, што энтузіязм, які выклікала сярод чыгуначнікаў адозва ЦК і СНК, радам арганізацый спачатку ня быў падхоплен і ўзначален. Нягнуткасьць, непаваротлівасьць, адсутнасьць выразнасьці і канкрэтызацыі кіраўніцтва—галоўная хвароба раду гаспадарчых, партыйных і прафсаюзных арганізацый чыгункі. Кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам—гэтымі асноўнымі мэтадамі барацьбы за здаровы транспарт—у большасьці яшчэ ня стала апэрацыйным, канкрэтным, жыстала апэрацыйным, канкрэтным, жывым. Усё яшчэ панує ў гэтай справе ожмоцёк. Часта з прычыны адсутнасьці кіраўніцтва спаборніцтва ператвараецца ва ўрачыстую дэкларацыйнасьць. Брыгады арганізуюцца вялікія і таму цяжка сачыць за работай кожнага ўдарніка. Слаба наладжан улік і аналіз работы. Не вядзецца барацьба за якасьць спаборніцтва, за ўзьняцьце яго на вышэйшую ступень. Замест гэтага ёсьць выпадкі бюракратычнага скажэньня ідэі спаборніцтва. Так, начальнік ст. Дрыса абвясьціў «перарэгістрацыю» ударнікаў, а МК ст. Шацілкі папулярызаваў сярод рабочых такую ўстаноўку, што «кожны сьвядомы рабочы павінен ШТОМЕСЯЧНА абвяшчаць сябе ўдарнікам».

У справе наладжаньня ўліку спаборніцтва трэба дабіцца крутога пераломy. Няма сумненьня, што асаблівасьць умоў транспарту ускладняе гэту справу ў параўнаньні з прамысловасьцю, але ж нельга лічыць, што ў даным выпадку нельга дабіцца неабходных посьпехаў. У нас ёсьць добры вопыт балавай сыстэмы, выкарыстаўшы гэты вопыт як аснову наладжаньня ўліку, можна ўстанавіць выразную сыстэму падліку работы. Гэтага трэба дабіцца, як найхутчэй. Устанаўленьне ўліку спаборніцтва, разбуйненьне брыгад дасьць павышэньне якасьці спаборніцтва, рост яго.

Увядзеньне НОВАЙ СЫСТЭМЫ ЗАРПЛАТЫ, УКАРАНЕНЬНЕ ЗЬДЗЕЛЬНАЙ АПЛАТЫ ПРАЦЫ (па МББ), сыстэмы прагрэсыўнай аплаты, прэмій і заахвочваньняў за выкананьне і перавыкананьне ўстаноўленых норм і матар'яльнае ўтрыманьне за нядобраякасную работу натыкаецца на мясцох на апартуністычнае супраціўленьне. Праведзеньне новай сыстэмы аплаты на чыгунках, якая стымулюе ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны, паляпшэньне якасьці работы зьяўляецца важнейшай работай у справе аздараўленьня чыгуначнага транспарту, у справе замацаваньня спаранай і падцягненьня ўсіх зьвенняў транспарту. Разам з гэтым, трэба рашуча біць па тых, хто ЗАТРЫМЛІВАЕ РЭАЛІЗАЦЫЮ ДЫРЭКТЫЎ ЦК і СНК АБ ПАВЫШЭНЬНІ ЗАРПЛАТЫ ПЭЎНЫХ ГРУП КВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОЧЫХ ТРАНСПАРТУ. Трэба палепшыць работу бюро нармаваньня, ушчыльніць рабочы дзень. Такое становішча, як у дэпо ст. МЕНСК, дзе на працягу рабочага дня НА ПРАДУКЦЫЙНУЮ РАБОТУ прыпадае ўсяго 59 проц., ня можа быць цярпіма. Правільная арганізацыя працы, поўная загрузка рабочага дня, узмацненьне працоўнай дысцыпліны, адзіначальня зьяўляецца асноўнай умовай выкананьня вымаральнікаў.

Кампанія пераходу НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК на транспарце разгортваецца недапушчальна слаба. Там, дзе яна пачалася, праходзіць бяз удзелу мас. Апартуністы і тут імкнуцца перашкодзіць важнейшаму мерапрыемству, правядзеньне якога забясьпечыць узьняцьце адказнасьці адміністрацыі, клієнта, рабочага, павышэньне працоўнай дысцыпліны, правільную расстаноўку сіл, прывядзе да хутчэйшага ўздыму транспарту.

Гаспадарчы разрахунак трэба ўкараніць ва ўсе вучасткі транспарту, пачынаючы ад дэпо і канчаючы асобнай брыгадай. Гаспадарчы разрахунак на дадным этапе зьяўляецца галоўнай умовай падняцьця транспарту і ён павінен быць праведзен па-бальшавіцку пры ўдзеле шырокіх мас рабочых-чыгуначнікаў.

БУДАЎНІЦТВА на чыгунцы грае вялікую ролю. Між тым, яно разгортваецца недапушчальна слаба. Ня ўсе аб'екты будаўніцтва забясьпечаны рабочымі чарцяжамі, плянамі, не хапае будаўнічых матар'ялаў, рабочай сілы, не выкарыстоўваюцца мясцовыя рэсурсы. У бліжэйшы-ж час, пры дапамозе мясцовых партыйных, савецкіх і прафсыяльных арганізацый трэба дабіцца пераломy ў гэтай рабоце. Адначасова павінна быць значна палепшана культурна-масавая работа сярод сэзоннікаў.

МАТАР'ЯЛЬНА-БЫТАВОЕ АБСЛУГОЎВАНЬНЕ чыгуначнікаў яшчэ не пастаўлена на адпаведную вышыню. Транспартная каапэрацыя не нападзіла бесьперабойнага забясьпячэньня чыгуначнікаў, не наладзіла забясьпячэньня рухомага складу. Гэта часткова тлумачыцца тым, што транспартная каапэрацыя не карыстаецца належнай дапамогай партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый. Трэба зразумець, што справа ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ чыгуначнікаў ёсьць ня толькі задача транспартнай каапэрацыі, але і ЎСІХ чыгуначных арганізацый. Работу каапэрацыі неабходна ўзяць пад пільны кантроль рабочых зьнізу.

ПАРТАРГАНІЗАЦЫ! чыгунак яшчэ цалкам не перабудаваліся. Гэта трэба зрабіць, як мага хутчэй. Партарганізацыя на чыгунках павінна дакладна ўявіць сабе, што яна пастаўлена на адзін з найбольш адказных вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва. Па-ўдарнаму перабудоўваючы сваю работу, яна павінна змагацца ў авангардзе рабочых-чыгуначнікаў за ліквідацыю пералічаных прарываў, за ўздым транспартнай гаспадаркі.

Пралетарыят прамысловых прадпрыемстваў БССР паказаў ужо разуменьне агульнасьці інтарэсаў рабочай клясы, адгукнуўшыся на заклік партыі арганізацыяй суботнікаў дапамога транспарту. Ён павінен працягваць дапамогу праз нападжваньне шэфства, перадачу лепшага вопыту сацыялістычнай арганізацыі працы і г. д.

Няма сумненьня, што пры дапамозе ўсяго пралетарыяту БССР, чыгуначнікі, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, ажыцьцяўляючы пастанову XVI зьезду УсеКП(б)Б, адозву ЦК і СНК і пастановы III Усебеларускага зьезду чыгуначнікаў, даб'юцца рашаючай перамогі на фронце аздараўленьня і сацыялістычнай рэканструкцыі транспарту, вывядуць яго з «вузкага» месца, чым дапамогуць яшчэ большаму росту ўсіх галін сацыялістычнага будаўніцтва.

Вышэй тэмпы работы на транспарце! Выганяючы апартуністаў, шкоднікаў і кулакоў з транспарту, шырэй разгорнем фронт сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, барацьбу за тэхніку, за цьвёрдую большавіцкую дысцыпліну, за выкананьне і перавыкананьне трансфінпляну.

Камсамольцы ўдарнікі за рамонтам трактару.

БЕЛАРУСКІЯ НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫСТЫ—КАТЫ І ПАГРОМШЧЫКІ

рэвалюцыйнай вучнёўскай моладзі

Па ўказаньні і даносах ахраньніка Астроўскага звыш 100 вучняў Віленскай Беларускай гімназіі была кінута ў фашысцкія засьценкі

Сапраўдны твар „абаронцаў беларускага народу“

У КАМПАНІІ З МАНАРХІСТАМІ, ФАШЫСТАМІ І АХРАНЬНІКАМІ

Беларускія нацыянал-фашысты—Луцкевічы, Астроўскія, Акінчыцы і К°—любяць граць ролю «абаронцаў беларускага народу».

Выяўляецца гэта асабліва цяпер, калі польскі фашызм узьняў шалёную антысавецкую кампанію, падрыхтоўваючы грамадзкую думку да ўзброенага нападу на СССР.

Пры «падзеле працы» беларускі нацыянал-фашызм атрымаў спэцыяльнае заданьне—брахаць на БССР, на фарпост Савецкага Саюзу.

Правакацыйнае цкаваньне Савецкай Беларусі вядзецца імі ва ўсю.

У кампаніі з эндэцкім фашысцкім «Дзеньнікам Віленскім», які да апошняга часу даказваў, што беларусаў зусім няма, у кампаніі з манархічна-абшарніцкім «Словам» і з фашысцкім «Кур'ерам Віленскім», вакол якога гуртуецца віленская дэфэнзыва,—беларускія нацыянал-фашысты льлюць кракадзілавыя сьлёзы аб «зьдзеках», якія, быццам, твораць бальшавікі над беларускім народам, аб «занападзе» беларускай культуры ў БССР і г. д.

Абвяргаць выдуманыя ў габінэтах Кіртыклісаў «факты» і даказваць няправільнасьць «вывадаў»—ясна ня пры ходзіцца.

Давайце лепш паглядзімо, як «казённыя плакальшчыкі», «абаронцы» беларускага народу», «змагары» за беларускую культуру абараняюць і змагаюцца за ўсё гэта сапраўды.

У дзейнасьці беларускіх нацыянал-фашыстаў начэснае, бязумоўна, месца, займаюць так званыя «гімназіяльныя падзеі». Сутнасьць гэтых падзей заключаецца ў бязьлітаснай барацьбе, якая вялася на арэне Віленскай беларускай гімназіі, паміж рэвалюцыйным антыфашысцкім лягерам і лягерам нацыянал-фашызму з мэтаю фашызацыі гімназіі.

Вучнёўства ВБГ складалася з дзяцей рабочых і сялянскай беднаты. Часта больш здольных сваіх дзяцей вясковая беднота пасылала калектыўна у сваю гімназію, што асабліва шырокі характар набыло ў часы разгорнутай работы ТБШ. Гурткі ТБШ сыстэматычна дапамагалі бяднейшым вучням сваіх вёсак.

Моладзь такая, маючы непасрэдную сувязь са сваёй клясай, адчуваючы на сабе ўсё ліха сацыяльнай і нацыянальнай няволі, была яскравым адлюстраваньнем тых настрояў і рухаў, якія бурлілі ў шырокіх масах працоўных Заходняй Беларусі. Больш таго. Моладзь такая, атрымаўшы магчымасьць штурмаваць «цьвярдыню навукі»—рабілася перадавой, сьвядомай рабоча-сялянскай моладзьдзю.

Бываючы ў сваіх вёсках, вучні праводзілі сярод сялянства асьведамляючую работу. Вёскі, якія мелі сваіх гімназістаў, адзначаліся ў ваколіцы сьвядомасьцю і добра-наладжанай культурна-асьветнай работай.

РАД СТАРАЦЦА..., ПАНОЧКУ

І вось польскі фашызм, выраўнуўшы разграміць гэты культурны ачаг працоўных Зах. Беларусі, даручае гэту справу ахраньніку Астроўскаму.

Да «працы» Астроўскі прыступіў адразу, з першых дзён 1928-29 навучальнага году. Пэдагагічная рада, да рэчы сказаць, была загадзя падрыхтавана фашызмам да барацьбы з рэвалюцыйным вучнёўствам. Усе настаўнікі, якія ня ўмелі «выхоўваць»—«кулаком і дубінкай»—былі выгнаны вонь. **Пэдагагічны пэрсанал гімназіі складаўся з аднэй толькі белагвардзейшчыны, дэфэнзыўшчыны і людзей прынцыпу — «хто больш дасьць».**

Пасьля няўдалага манэўру—аўдаваць вучнёўствам і падпарадкаваць яго сваім уплывам з мэтаю фашызацыі—**Астроўскі разграміў вучнёўскія арганізацыі («Вучнёўскі гурток» з усімі яго сэкцыямі, каапэратыў, вучнёўскую часопісь «Голас вучня»), забараніў чытаць рэфэраты, падзіць спэктаклі і ўвёў вайсковы рэжым.**

Далей ахраньнік Астроўскі перайшоў **да выключэньня «непажаданага элемэнту» з гімназіі.**

Першае масавае выключэньне вучняў мела месца ў канцы сьнежня 1928 г., якраз перад калядзкімі канікуламі, калі вучні павінны былі разьехацца дамоў. Па яго «рэкамэндацыі» Куратарыум Віленскай школьнай акругі афіцыйным парадкам звольніў **каля 30 вучняў** старэйшых клас, пераважна 6, 7 і 8-й. Матывы звальненьня: удзел у нелегальным зьезьдзе ТБШ і, нібы, «прыналежнасьць да камсамолу Зах. Беларусі».

Выключаныя атрымалі паведамленьне аб гэтым напярэдадні разьезду на канікулы. Астроўскі хацеў пазбавіцца ад усіх «няпрыемнасьцяй» і пратэстаў з боку рэшткі вучняў і сьвядома давёў гэта да канікулаў, думаючы, што вучні разьедуцца і на гэтым усё скончыцца. Але ён памыліўся. **У гэты-ж дзень уся гімназія забаставала. Вучні патрабавалі ад пэдагагічнай рады безадкладнага прыняцьця ўсіх звольненых назад у гімназію.**

Астроўскі зварачаецца **за дапамогай** да паводы. Праз паўгадзіны зьявілася **паліцыя і шпікі, якія арыштавалі выключаных вучняў і пры агульным абурэньні моладзі, пры варожых выгуках з яе боку—вывезьлі ў цэнтральны арышт.**

Баставаўшых сілай павыкідалі на двор і канфлікт лічыўся зьліквідаваным». Астроўскі салодка аблізваўся, думаючы, што, нарэшце, «на камунізьме» ў гімназіі пастаўлен крыж.

БАЛАХОВЕЦ—У ЯКАСЬЦІ ВЫХАВАЛЬНІКА

Прыехаўшы пасьля калядных канікулаў у гімназію, вучні засталі яшчэ больш узмоцнены рэжым.

На дзьвярах інтэрнату, у якім жыла большасьць правіцыяльных вучняў, вісела пяць замкоў розпага гатунку. Гэтым Астроўскі хацеў ізаляваць інтэрнат ад «чорных сіл». Інтэрнат ператвараўся ў сапраўдную турму. Вучняў ня пускалі ў горад. У інтэрнат ня пускалі «пастароньніх», у рад якіх былі залічаны, між іншым, усе выключаныя вучні. Кіраўніком інтэрнату Астроўскі зрабіў нейкага **балахоўца** Баўтрука, які кожны дзень яму складаў рапарты аб «сытуацыі». У інтэрнаце Баўтрук разгарнуў сваю «дзейнасьць» ва ўсю. **Забараніў вучням пяць песьні** (было, між іншым, забаронена пяць беларускую марсэльезу «Ад веку мы спалі...»). Кожную кніжку, якую чытаў хто-небудзь з вучняў, Баўтрук абавязкоав павінен быў **«сцэнзураваць».** Усё было на «вае ным становішчы».

Вучні пры кожнай магчымасьці дэманстравалі сваю нездаволенасьць. Выяўлялася гэта найчасьцей сьпевам рэвалюцыйных песень. Як правіла, ідучы радамі на вячэру (чым не казармаўн чына?), вучні запявалі «Маладняк», «Марш Будзёнага». На зьвяраэлыя крыкі Баўтрука не зварачалі ўвагі, або адказвалі сьмехам. Гэта прыводзіла яго проста ў шол.

Такім чынам, салодкія лятуценьні Астроўскага аб «жаданым спакоі» лопнулі, як мыльныя бурбалкі.

Прышлося яму зноў перайсьці да «чысткі», цяпер ужо **маладзейшых кляс.**

Кожны вучань быў пад пагрозай, што ня сёньня—заўтра яго звольняць. Узрастала абурэньне.

Надыходзіў дзень апэляцыйнага суда над Грамадой, **дзень судовай камэдыі над працоўнымі Зах. Беларусі**—28 лютага 1929 г.

УСЕАГУЛЬНЫЯ ЗАБАСТОЎКІ ВУЧНЯЎ

27 лютага, за некалькі хвілін перад званком на лекцыі, у гімназію ўвайшлі выдаленыя «на кароткі час» вучні—Таўлай, Гаўрылік, Тарасюк, накіраваўшыся ў агульную залю.

Убачыўшы гэта, Астроўскі аж прысеў ад страху, і, калі толькі Юрка Тарасюк абвясьціў забастоўку—ён, як дзікі зьвер, кінуўся на Тарасюка і ўдарыў па твары.

Гэта адразу запаліла вучняў. Усе кінуліся на Астроўскага. Ён ледзь уцёк. Усьлед яму неслася:

Прэч крывавых душыцеляў вучнёўскай моладзі!

Кат! Прадажнік! Правакатар! Фашыст!

Пасьля мітынгу вучні, сьпяваючы «Маладняк» і «Адвеку мы спалі», накіраваліся ў калідор, каб сарваць лекцыі ў трох старэйшых клясах. — 6, 7, і 8, дзе сынкі Астроўскіх і Віленскія мяшчане—па некалькі чалавек у клясе—працягвалі «вучыцца».

З РЭВАЛЬВЭРАМ—НА ВУЧНЯЎ

Астроўскі хацеў недапусьціць нас да гэтага і зачыніў дзьверы вялікай залі. Вучні выламалі іх і пайшлі далей. У 6-й—7-й клясах лекцыі сарвалі, выпнаўшы «пільных» вучняў з кляс. Падышлі пад 8-ю клясу. Тут «вучыліся» тры фармальныя шпікі і некалькі сынкоў і дачок Астроўскіх і Каўшоў. У гэты час чытаў у 8-й клясе лекцыю **Віспаўх** — выкладчык гісторыі Польшчы, **фашыст, адзін з кіраўнікоў «Віленскага Кур'ера», актыўны дапамокнік Астроўскага ў фашызацыі гімназіі, спэцыяльна дэлегаваны сюды Кіртыклісам і віцебскай дэфэнзывай.**

Калі мы адчынілі дзьверы і загадалі пакінуць клясу, ён настолькі спалохаўся, настолькі «вышаў з сябе», што **кінуўся на пярэдніх вучняў з рэвальвэрам.**

— Прэч дэфэнзыўшчыкаў Віслаўхаў!

— Рэвальвэрам нас не запалохаеш!—нясьлося яму ў адказ.

Віслаўх падагнуў хвост і быў прышуган уцякаць. Лекцыі былі сарваны. Вучні засталіся гаспадарамі становішча. Сьвяткавалі перамогу.

— Усіх выдаленых вучняў прыняць у гімназію!

— Спыніць фашызацыю гімназіі!

— Спыніць камэдыю суда над Грамадой!—гучэлі лёзунгі на ўсёй гімназіі.

У прамовах выкрывалі здраду Астроўскага, Луцкевіча і К°, якія тады яшчэ прыкрываліся фразамі: «Мы баронім Грамаду», «Мы шчырыя грамадаўцы» і г. д.

Мы выкрывалі сапраўдную мэту судовай камэдыі над Грамадой, мэту душэньня ТБШ, фашызацыі гімназіі, як падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР і БССР, Воклічы «Няхай жыве Савецкі Саюз», «Няхай жыве Савецкая Беларусь»—не змаўкалі.

Усё гэта прыводзіла Астроўскага ў ярасьць. Але ён хацеў выглядаць «спакойным». Хадзіў і барматаў пад нос:

— Ну, фашыст! Ну, здраднік! Ну, прадажнік!

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ АСТРОЎСКАГА ПАЛІЦЫЯ ШТУРМУЕ ВУЧНЯЎ

Але Астроўскі ня спаў. Зразумеўшы, што сам нічога ня зробіць — ён паслаў кур'ера ў паліцыю «за дапамогай». Зьвілася двое паліцэйскіх, якія загадалі тром вучням—Таўлаю, Гаўрыліку і Тарасюку—пайсьці з імі па пастарунак. Аднак, вучні не дазволілі паліцыі арыштаваць сваіх таварышоў, заяўляючы:—Бярэце нас усіх.

Паліцэйскія зьніклі. Праз пару хвілін гімназіяльны двор зараіўся ад яўнай і тайнай паліцыі. Паліцыя і шпікі кінуліся ў залю, дзе мы, моцна згуртаваўшыся, чакалі атакі.

Няпрошаных гасьцей вучні спаткалі воклічам «Прэч з паліцыяй!» і сьпевам беларускай марсэльезы.

Паліцыя са штыкамі на перавес акружыла бастуючых, якіх налічвалася каля 150 асоб.

«Дзейнічалі» яны вельмі асьцярожна, бо думалі, як выявілася пасьля, што мы будзем «страляць і кідаць бомбы» (у страху вочы вялікія). Калі ўсё было «гатова», увайшоў з журналам сам Астроўскі і **пачаў чытаць прозьвішчы усіх бастуючых,** пытаючыся кожнага «ці хочаш вучыцца?». Усе адказвалі: «Хочам вучыцца. Але ня хочам на вукі з калом. Прэч прадажніка!»

ПАГРОМ ГІМНАЗІІ

Гэтага было ўжо занадта шмат для Астроўскага. Ён са зьвярыным злосьцю пачаў **паказваць паліцыі «каго браць».** У першую чаргу загадаў арыштаваць трох выключаных ім вучняў. Але іх моцна трымалі таварышы і шпікам ня лёгка было вырваць гэтых таварышоў з радоў бастуючых вучняў. Нарэшце, **прыкладамі і штыхамі яны «прачысьцілі» сабе шлях.** Апрача гэтага, **арыштавалі яшчэ 9 таварышоў.** У залі тварыліся нячуваныя сцэны. Лёзунгі, сьпевы, крыкі, мяшаючыя вучаніц разьдзіралі навстра. **І над усім гэтым, як цар, сталу пан Астроўскі, «змагар» за «беларускі народ».** Адзін з вучняў кінуў тады яму ў твар.

— **«Цешся і радуйся, пане Астроўскі —тваё сьвята.**

Арыштаваных 12 вучняў взьвярэлая паліцэйшчына зьбіла і накіравала ў турму. Мы рэагавалі на зьдзекі лёзунгамі і сьмехам. Нават дэфэнзыўшчыкі паціскалі плячыма і дзівіліся:

— «Пся крэв! Іх б'юць, яны сьмяюцца.

Пад вечар да нас у камэру прывалілася яшчэ звыш 50 вучняў. Аказалася, што калі забастоўка ня спынялася і надалей, **пачалі арыштоўваць усіх, хто баставаў.** Сьмешна было глядзець, як **паліцыя вяла арыштаваных 10-гадовых вучняў з першае клясы.**

На заўтра ўсіх пачалі развозіць этапным парадкам да сядзьбы. З усіх нас пакінулі ў турме толькі трох, **якіх Астроўскі аддаў пад суд.**

ПРАТЭСТЫ ПРАЦОЎНЫ ЗАХ. БЕЛАРУСІ СУПРОЦЬ ПАГРОМУ

Як мы пасьля даведаліся, на другі дзень пасьля пагрому ў нашай гімназіі **забаставала ў знак пратэсту супроць гвалту над вучнямі большасьць фабрык Вільні. Забаставалі ў знак салідарнасьці і некаторыя яўрэйскія школы.**

Вучні, разьехаўшыся па вёсках, расказалі, зразумела, аб «рабоце» Астроўскага. **Пачаліся масавыя пратэсты.** Працоўныя Заходняй Беларусі, пад кіраўніцтвам КПЗБ, дэманстравалі сваю салідарнасьць з вучнямі ВБГ. Астроўскі канчаткова скампрамэтаваўся. Фашызацыя «шпікам» ня ўдалася. Атрымаўся такі «хрэмуй», якога ніяк не спадабаўся Астроўскі. Зьмяні ста выключаных вучняў, верных рабоча-сялянскай справе, Астроўскі пазбавіў навукі. Яны кінуліся ў масы і там даказалі сваю адданасьць справе рэвалюцыі. **Большая частка іх цяпер сядзіць у розных турмах Польшчы.** Частка з іх ужо адсудзжана па многія гады катаргі. Частка чакае яшчэ катаржных прысудаў. **Усім ім дапамог сесьці за краты ахраннік Астроўскі. На кожным вучнёўскім судзе фігуравалі яго «характарыстыкі».**

Дзесяткі вучняў кінуты за краты, дзесяткі іх будуць задушаны паліцэйшчынай у турэмных казэматах, але нацыянальна-вызваленчага руху працоўных мас ніякім тэрорам польскаму фашызму і яго прыхвасьцям беларускім нацыянал-фашыстам—не задушыць.

Былы вучань.

СЛАЎНЫ ШЛЯХ

10 год ЦО ЛКСМБ— газэты „Чырвоная Зьмена“

Гістарыя юнацкага друку на Беларусі, якая асабліва ярка ўвасабляецца 10-годзьдзем «Чырвонай Зьмены», ёсьць неадлучная частка слаўных гістарычных старонак існаваньня і барацьбы ЛКСМБ.

Ленінскі камсамол Беларусі нарадзіўся сапраўды ў гарніле вялікіх і рашаючых клясавых баёў. З маленькіх груп адважных пралетарскіх юнакоў, якія разам са сваімі старэйшымі братамі і бацькамі, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, самаддана, крывёю адстойвалі заваёвы Кастрычніка, — вырасла вялікая армія беларускага камсамолу.

У барацьбе са шматлікімі акупантамі (немцы, Пятлюра, Балаховіч, белапалякі), у змаганьні з гэтай чырвай зграяй, якая катаваньнем і пажарамі, драпежніцтвам хацела задушыць маладую савецкую рэспубліку — фармаваліся першыя калёны камсамольцаў-чырвонагвардзейцаў, партызан.

У сьнежні месяцы 1918 году арганізацыйна афармляюцца ў буйнейшых гарадох Беларусі камсамольскія ячэйкі. Сьледам за гэтым арганізоўваецца Цэнтральны Камітэт камсамолу Беларусі і Літвы.

Камсамольскімі арганізацыямі ў гэты час выдаецца шмат лістовак, зьмест якіх быў запоўнен агнёвым заклікам працоўнай моладзі ў рады саюзу, пад сьцяг бальшавіцкай партыі, каб разам «з моцнай арганізацыяй камуністычнага саюзу зьнішчыць дашчэнту капіталістычны лад і на яго руінах утварыць вольнае панаваньне працы».

2 сакавіка 1919 году выдаецца першы друкаваны орган ЦК камсамолу Беларусі і Літвы — часопісь «Факел камунізму».

«Факел камунізму» на ўвесь голас заяўляе, што пачалася «грозная бойка», бойка «не на жыцьцё, а на сьмерць», ён заклікае ўвесь саюз., усю працоўную моладзь стаць несакрушальнай сьцяной на абарону вялікіх заваёў.

Загнаны ў падполье польскай акупацыяй, перамагаючы вялікія труднасьці, «Факел камунізму» ня спыняе сваёй дзейнасьці.

Падпольныя камсамольскія арганізацыі, ня гледзячы на люты зьвярыны белапольскі тэрор, выдаюць цэлы рад лістовак, праклямацый — уздымаюць бадзявы настрой і рэвалюцыйны запал партызанскіх атрадаў, якія з тылу наносяць сьмяротныя ўдары азьвярэлым бандам белапольскіх акупантаў.

Пад націскам гэраічнай Чырвонай армії, пры актыўнай дапамозе партызанскіх атрадаў і ўсіх працоўных—Савецкая Беларусь ачышчаецца ад акупацкіх банд.

Вышаўшы з падполья, камсамольская арганізацыя Беларусі, пад кіраўніцтвам партыі, разгортвае вялікую масавую агітацыйную работу, арганізуе працоўную моладзь на барацьбу з недабітымі ворагам унутры краіны, на ліквідацыю спадчыны царызму і вынішчаў руйнуючай дзейнасьці акупантаў.

У верасьні 1920 г. адбываецца першы ўсебеларускі зьезд камсамолу.

Напярэдадні другога зьезду (май 1921 году) ажыцьцяўляецца ідэя, высунутая камсамольскім масамі — 21 красавіка выходзіць першы нумар сёньняшняга юбіляра — газэты «Красная смена».

З першых-жа нумароў «Красная смена» вызначае свае задачы, як масавай газэты працоўнай моладзі. Яна пястомна заклікае працоўную моладзь «быць напагатове», «трымаць порах сухім», бо «вораг ня дрэмле».

Пераключаючы сваю работу ў адпаведнасьці з новымі задачамі,—з задачамі аднаўленчага пэрыяду, газэта рашуча змагаецца з панікёрскімі настроямі, з хыканьнем, якія сям-там праяўляліся ў асяродзьдзі саюзу з прычыны неразуменьня сутнасьці толькі-што ўведзенага нэпу.

Камсамольскія арганізацыі разгортваюць вялікую работу на абслугоўваньні эканамічных інтарэсаў работай моладзі, на ўздыме сваёй тэарытычнай, агульнай і палітычнай адукацыі.

Ставіцца пытаньне аб узмацненьні ўдзелу камсамолу ў аднаўленьні народнай гаспадаркі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

«Чырвоная Зьмена» бярэ рашучы курс на зьнішчэньне голай мітынгоўшчыны, агіткі і пераключэньня ўвагі ЛКСМБ на выкананьне пастаўленых партыяй баявых гаспадарчых задач.

У адпаведнасьці з гэтымі задачамі газэта крочыць у ногу з усім Саюзам, яна разгортвае вялікую работу ў справе пралядзеньня вытворчых конкурсаў, ажыўленьня пард, барацьбы за працоўную дысцыпліну на прадпрыемствах, супроць п'

Да адказнасьці зрыўшчыкаў партвучобы

У ВУЛЬСКІМ І ПЛЕШЧАНІЦКІМ РАЁНАХ ПАРТАСЬВЕТА ЗІМОВАГА ПЭРЫЯДУ ПРАВАЛЕ

Шырока скарыстаць завочныя формы навучаньня для павышэньня тэарытычнага ўзроўню партыйных мас

Папярэдзіць зрыў завочнага навучаньня

Упічваючы неабходнасьць масавай падрыхтоўкі кіруючых кадраў камуністаў, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б зацьвердзіў агульны кантынгент па масавай завочнай партасьвеце ў 7.000 асоб. Гэта значыць, што на працягу некалькіх месяцаў ахоп завочнай партасьветай актыву павінен павялічыцца ў 3 з пап. разы. Практычнае ажыцьцяўленьне гэтага мерапрыемства перад масавым завочным навучаньнем высоўвае наступныя асноўныя задачы: павялічыць агульны кантынгент камуністаў, якія ахапляюцца завочнай партасьветай; перабудаваць адпаведным чынам і палепшыць якасьць работы ўстаноў завочнай партасьветы, з такім разьлікам, каб сваячасова выканаць праграмы, якія адпавядаюць пэўным стацыянарным навучальным установам; падрыхтавацца да падагульненьня ведаў завочнікаў на курсах-кайфэрэнцыях.

Вясеньняе камплектаваньне сеткі завочнага навучаньня павінна было даць завочнаму камвузу 1.500 слухачоў, камсамольскаму унівэрсытэту 500, саўпартшколе пры камвузе таксама 500, курсовому сэктару ўсебеларускай саўпартшколы 1.000 асоб, радыё-курсам 1.000, усяго 4.500 слухачоў. Паасобныя раёны павінны былі камандыраваць на завочнае навучаньне дзесяткі і сотні камуністаў, камсамольцаў і беспартыйнага актыву. Адзін толькі МЕНСКІ ГАРКОМ ПАРТЫІ павінен быў камандыраваць у завочны камвуз 200 асоб, у камсамольскі унівэрсытэт — 60, саўпартшколу — 120 і на радыё-курсы — 200 чалавек. ГОМЕЛЬСКІ, ВІЦЕБСКІ і іншыя раёны павінны былі даць сотцы партасьветы сотні камуністаў і камсамольцаў. Непрамысловыя раёны павінны былі ў сярэднім камандыраваць для завочнага навучаньня па 42-46 асоб кожны.

Як-жа раёны выканалі дырэктыву партыі па камплектаваньні розных відаў завочнага навучаньня?

На сёньняшні дзень мы маем таварышоў, якія прайшлі мандатную камісію па ЗКУ 773 асобы і 647 асоб веснавога набору, якія знаходзяцца ў стадыі афармленьня. Усяго-ж налічваецца па ЗКУ 1.420 асоб. Разьвёрстка па веснавым наборы ў ЗКС ня выканана на 80 асоб, па камсамольскім унівэрсытэце ня выканана на 32 проц. Па саўпартшколе паступіла 130 заяў, або 26 проц. вызначанай плянам колькасьці, а па Гомельскай саўпартшколе толькі 380 заяў, або 36 проц. На радыё-курсы паступіла 80 чалавек або 16 проц. НЕДАВЫКАНАНЬНЕ ПРЫПАДАЕ ГАЛОЎНЫМ ЧЫНАМ, НА ПААСОБНЫЯ БУЙНЫЯ ПРАМЫСЛОВЫЯ РАЁНЫ, У ПРЫВАТНАСЬЦІ НА МЕНСКІ, ЯКІ ДАЎ ПА ВЕСНАВЫМ НАБОРЫ Ў ЗКУ ЎСЯГО 26 АСОБ, НЕ КАМАНДЫРАВАЎШЫ НІ АДНАГО ТАВАРЫША Ў КАМСАМОЛЬСКІ УНІВЭРСЫТЭТ, САЎПАРТШКОЛУ І НА РАДЫЁ-КУРСЫ ПАРТАКТЫВУ. Вельмі дрэнна стаіць справа з камплектаваньнем у розных віды масавага завочнага навучаньня і па ШКЛОЎСКІМ, ГОРАЦКІМ, ЛЕПЕЛЬСКІМ і інш. буйных раёнах.

Побач з [illegible], якія недапушчальна адстаюць [illegible] актываваньні, мы маем рад раёнаў, [illegible] правыканалі расклад ЦК КП(б)[illegible] камплектаваньні ўсіх відаў завоч[illegible]учаньня. Да такіх раёнаў адносяцца [illegible] АСІПОВІЦКІ, БЫХАЎСКІ, РАГАЧОЎСКІ, РЭЧЫЦКІ і інш.

Гэта паказвае, што пры належнай увазе да справы камплектаваньня сеткі завочнага навучаньня тую разьвёрстку, якая дана, МОЖНА З ПОСЬПЕХАМ ВЫКАНАЦЬ.

Упічваючы пагражаючае становішча камплектаваньня завочных форм партасьветы, ЦК КП(б)Б даў дырэктыву раёнам аб правядзеньні з 1 мая УДАРНАГА МЕСЯЧНІКА ВЯРБОЎКІ І ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ У ВЫКАНАНЬНІ НАВУЧАЛЬНЫХ ПЛЯНАЎ. Раённым камітэтам партыі неабходна зараз-жа разгарнуць шырокую растлумачальную работу па ўцягненьні партыйнага і камсамольскага актыву ў завочнае навучаньне.

Другая задача — дасягнуць у вучобе такіх тэмпаў, якія-б на працягу самага кароткага пэрыяду забясьпечылі аўпаданьне ведамі па праграмах у аб'ёме адпаведных станцыянарных устаноў.

Тэмп прапрацоўкі заданьняў ЗКС значна адстае ад тэрмінаў, устаноўленых навучальным плянам. У сярэднім навучальны плян першага сэмэстру выкананы толькі на 50 проц. Гэта тлумачыцца тым, што слухачы правялі не даволі ўважлівыя адносіны да вучобы. Многія завочнікі адкладваюць прапрацоўку заданьняў на далейшы час, матывуючы гэта перагружанасьцю і хадам палітычна-гаспадарчых кампаній. Раённыя камітэты партыі зусім не аддаюць увагі завочнаму навучаньню. Завочнікаў перагружаюць рознымі даручэньнямі, завочнае навучаньне ня пічаць за партнагрузку.

Кіраўніцтва завочным навучаньнем у сваю чаргу мае рад недахопаў. Часопісі, у якіх зьмяшчаюцца заданьні, выходзяць са спазьненьнем, рэцэнзіі часамі адсылаюцца праз месяц-два пасьля атрыманьня работ завочнікаў, якасьць мэтадычных указаньняў часамі вельмі дрэнная.

Усе вышэйпаказаныя недахопы ПАВІННЫ БЫЦЬ ЛІКВІДАВАНЫ, ЯК З БОКУ ЗАВОЧНІКАЎ, ТАК РАЁННЫХ КАМІТЭТАЎ ПАРТЫІ І КІРАЎНІЦТВА ЗАВОЧНЫМ НАВУЧАНЬНЕМ.

Інстытуту масавага завочнага навучаньня неабходна больш увагі аддаць падбору рэцэнзэнтаў і кіраўнікоў паасобных дысцыплін, якія-б адпавядалі свайму прызначэньню, а таксама паскорыць выданьне часопісі. Трэба зараз-жа прыступіць да падрыхтоўкі і правядзеньня курсаў-кайфэрэнцый па падагульненьні ведаў завочнікаў, якія прапрацавалі праграму першага году навучаньня. Гэтыя курсы-кайфэрэнцыі павінны быць праведзены ў ліпені. Трэба зараз-жа ўзяць на вучот тых таварышоў, якія прапрацавалі ўжо ўвесь курс, або большую частку яго. Адносна апошніх трэба паставіць пытаньне аб папяпшэньні кансультацыйнага абслугоўваньня іх. Гэтым таварышом неабходна прыступіць да выкананьня экзаменацыйных работ па ўсім курсе. Усе таварышы, якія хочуць датэрмінова распрацаваць праграму падрыхтоўчага або першага курсу ЗКУ, або здаць вусна заліки, павінны падаць заяву ў ЗКС КУБ'а.

Прарывы на фронце завочнага навучаньня павінны быць ліквідаваны, і ў першую чаргу праз пашырэньне мэтадаў сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

МАКОЎСКІ.

Чырвонаармейцы за вывучэньнем кулямёту

Парт'ячэйкі не рэагуюць

НА УХІЛЕНЬНЕ АД ВУЧОБЫ

За апошні час рэзка вызначылася пагроза зрыву вучобы ў Менскай гарадзкой саўпартшколе. Ня гледзячы на рад катэгарычных дырэктыў ЦК партыі аб пастаноўцы партыйнай вучобы на належную вышыню, аб рашучай барацьбе з недаацэнкай вучобы, як праявай апартунізму на прыстыцы, усё-ж у радзе парт'ячэек не аддана належная ўвага тлумачэньню бальшавіцкага аўладаньня марксыцка-ленінскай тэорыяй, што зьяўляецца важнейшай і неабходнай умовай для пасьпяховага ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Аб недаацэнцы партыйнай асьветы асабліва ярка сьведчаць нядбайныя адносіны з боку многіх ячэек да таго, каб забясьпечыць рэгулярнае праведваньне слухачамі заняткаў ГСПШ. Калі ў пачатку заняткаў у гэтай школе на радзе заводаў і фабрык («Камунарка», «Кастрычнік», «Беларуская», «Камунарка», тканцкая фабрыка, шчотачная, ЦПІ і інш.) было запісаных ад 20 да 40 чалавек з кожнага прадпрыемства, дык зараз праведваюць ня больш як па 2-3 чалавекі. Зрывы заняткаў ствараюцца ня толькі па віне слухачоў, але і па віне раду выкладчыкаў. Парт'ячэйкі ніякіх захадаў ня ўжываюць у адносінах да тых таварыщоў, якія бяз уважлівых прычын не наведваюць школы, ухіляюцца ад заняткаў на вытворчасьце.

Частка слухачоў школ ухіляецца ад вывучэньня беларускай мовы, уходзіць з заняткаў у часе яе выкладаньня. Зразумела, што такое сьвядомае ўхіленьне ад вывучэньня беларускай мовы, недапушчальнае ігнараваньне дырэктыў партыі аб беларусізацыі дельна шкодзіць распаўсюджваньню, як праяву вялікадзяржаўнага шавінізму і з гэтым трэба весьці самую бязьлітасную барацьбу.

У значнай меры адбіваецца на ходзе заняткаў па партасьвеце тое, што рад арганізацый, асабліва гарсавет і прафарганізацыі, асабліва гарсавет і прафсаюзныя арганізацыі ігнаруюць дырэктывы гаркому КП(б)Б правядзеньнем у дні партыйнай вучобы розных пасяджэньняў, нарад і сходаў.

На гэтых днях становішча вучобы ў ГСПШ было абмеркавана на сходзе слухачоў школы. Сход асудзіў дэзэртырэў з фронту вучобы, расцэньваючы ўхіленьне ад заняткаў, як праяву апартунізму на практыцы. Сход заклікаў усіх слухачоў правесьці на прадпрыемствах адпаведную работу і склясьці грамадзкую думку вакол важнасьці партвучобы і неабходнасьці наведваньня заняткаў.

Т.

Даручалі і запісвалі...

Парткалектыў гомельскіх воднікаў складаецца з 45 членаў і 25 кандыдатаў. На эксплёатацыйным раёне працуе 1.750 чал. беспартыйных рабочых. Партыйная арганізацыя воднікаў не забясьпечыла разгортваньня партвучобы і палітычнага выхаваньня рабочых мас. Наколькі слаба пастаўлена масавая работа сярод воднікаў паказвае той факт, што за апошняе паўгодзьдзе з усяго складу беспартыйных рабочых, уцягнута ў партыю толькі два чалавекі.

Да арганізацыі сеткі партасьветы парткалектыў аднёсься фармальна. Разглядаючы на бюро калектыву пытаньне аб партвучобе, была прынята пастанова даручыць т. т. Ткачову і Емельянчыку абезьпечыць запіс у школы і гурткі і паставіць гэта пытаньне на чарговым сходзе. Абмеркаваўшы гэта пытаньне на сходзе парткалектыву, пастанавілі «даручыць бюро распрацаваць плян і працягваць запіс у розныя віды вучобы».

Сьпісы былі складзены на 54 асобы, з якіх 37 партыйцаў і 17 беспартыйных. На завочнае навучаньне запісаныя 16 чал., у ВСПШ другой ступені 8 чал. і г. д. Але фактычна вучоба ня была разгорнута як належыць. Некаторыя асобы, якія запісаліся, з першых дзён заняткаў ухіляліся ад наведваньня школ. Ніхто ў парткалектыве не выкарыстоўвае завочных форм вучобы. Такое становішча сьведчыць аб апартуністычнай недаацэнцы партыйнай асьветы і няўменьні ўвязаць партыйнай вучобы з задачамі рэканструкцыі і паляпшэньня работы воднага транспарту.

Гарком КП(б)Б ведае аб прарывах ва ўчобе, але нічога ня ўжывае для іх ліквідацыі.

Кавалёў.

Прадастаўлена самацёку

Матар'ялы абсьледваньня становішча партыйнай асьветы ў Плешчаніцкім раёне сьведчаць, што партыйная асьвета ня стала адным з важнейшых зьвеньняў партработы. Плешчаніцкая райпартарганізацыя напалову складаецца з кандыдатаў, зусім невыстарчальна забясьпечана кадрамі. Гэта становішча патрабавала тым больш бальшавіцкай увагі з боку парт арганізацыі да разгортваньня партыйнай вучобы. Аднак, на справе мы бачым іншае.

У рабоце школ па партасьвеце прарывы ўсё павялічваюцца. Так, напрыклад, з 135 слухачоў ВСПШ засталося толькі 34. Партыйная сетка ў гэтым скарацілася на 40 проц. У большасьці школ (Плешчаніцы, Каменка, Прусавічы і інш.) зусім спыніліся заняткі, а ў тых школах, якія яшчэ працуюць, наведваньне вельмі слабое.

Райком партыі ня ўжыў адпаведных захадаў для папярэджаньня адсеву са школ і спыненьня ў іх заняткаў. Уся работа на партасьвеце была прадастаўлена самацёку. Аб гэтым сьведчыць тое, што райком з часу разгортваньня сеткі партасьветы ня цікавіўся гэтай работай, не заслухаў дакладу ні аднэй ячэйкі аб стане партвучобы, не праведзена ні аднэй нарады па гэтым пытаньні. Заняткі ў школах партасьветы ня ўвязваліся ў выстарчальнай меры з чарговымі палітычна-гаспадарчымі задачамі.

Гэты недахоп трэба неадкладна выправіць.

Асаўляк.

На арганізацыях КП(б)Б

На фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» (Мазыр) за апошні час 7 раз зрываліся заняткі саўпартшколы па віне прапагандыста і райкому партыі. Райком чамусьці лічыў нармальным адымаць прапагандыста ў тыя дні, калі адбываліся заняткі, і пасылаць на розныя кампаніі. А зараз райком чамусьці зусім забраў прапагандыста і паслаў на другую работу і такім чынам зусім спыніў заняткі школы.

Брыгадзір Яргопін.

Партвучоба па Вульскай раённай партарганізацыі сарвана. Толькі пры торфазаводзе і калгасе «Зьвязда» сяк-так адбываліся заняткі.

Раённае кіраўніцтва Вульскай арганізацыі ня кіравала партасьветай, па апартуністычнаму недаацэньвала гэтага важнейшага вучастку партработы.

А.

Магутная хваля рэвалюцыйнага руху

ПАТРАСАЕ КАПІТАЛІСТЫЧНУЮ СЫСТЭМУ

Сход партактыву, ухваляючы пастановы XI пленуму ВККІ, вітае гэраічную барацьбу брацкіх кампартый

Рэзалюцыя агульнага сходу партактыву менскай гарпартарганізацыі па дакладу тав. Міцкевіч-Капсукас аб выніках XI пленуму ВККІ

Агульны сход актыву партыйнай арганізацыі г. Менску цалкам і поўнасьцю ўхваліў і далучаецца да пастаноў XI пленуму ВККІ, якія выпрацаваны на аснове марксыцка-ленінскай тэорыі і рэвалюцыйнай практыкі і якія яшчэ больш узбагачаюць вопыт брацкіх кампартый у іх барацьбе супроць капіталу за сусьветны Кастрычнік.

Агульны сход партактыву зазначае, што пленум даў глыбокі аналіз развалу капіталістычнага ладу, усёй капіталістычнай сыстэмы—сыстэмы варварскай эксплёатацыі працоўных, а таксама і правільную ацэнку пераможнага будаўніцтва сацыялізму ў СССР.

Пленум ясна паказаў, што ў той час, як у Савецкім Саюзе адбываецца бурны рост сацыялістычнага будаўніцтва, зацяжнаецца набудова фундаманту сацыялістычнай эканомікі, — капіталістычны сьвет надыходзіць да канца сваёй гнілой капіталістычнай стабілізацыі.

Капіталізм задыхаецца ў ціскох сваіх уласных супярэчнасьцяй. Крызісам ахоплены ўсе капіталістычныя краіны, усе важнейшыя галіны вытворчасьці і ў найбольш вострай форме сельская гаспадарка. Асабліва востры крызіс, які мяжуецца з катастрофаю, перажывае суседняя з намі фашысцкая Польшча, дзе кожны другі рабочы зьяўляецца беспрацоўным. Капіталізм шукае выхаду з крызісу, з аднаго боку — на ўзмацненьні эксплёатацыі працоўных мас, з другога — у падрыхтоўцы ўзброенага нападу на Савецкі Саюз.

Бязупынна катастрафічнымі тэмпамі расьце мільённая армія беспрацоўных у краінах капіталу, зьніжаецца зарплата, расьце галеча і голад сярод мільёнаў беспрацоўных пралетараў. Адначасова з гэтым узмацняецца тэрор, асабліва ў суседняй Польшчы, на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне. На барбарскую эксплёатацыю, прыгнечэньне і шалёны тэрор працоўныя масы адказваюць рэвалюцыйнымі выступленьнямі і забастоўкамі. Бурная хваля рэвалюцыйнага руху падымаецца ўсё вышэй і вышэй, патрасаючы асновы загніваючай капіталістычнай сыстэмы. Асабліва бурны ўздым рэвалюцыйнага руху наглядаецца ў фашысцкай Польшчы, Нямеччыне і Кітаі. Выступленьні беспрацоўных у фашысцкай Польшчы і Нямеччыне штораз усё больш носяць упарты і баявы характар.

Актыў менскай гарадзкай арганізацыі вітае гэраічную брацкую кампартыю Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якія пад кіраўніцтвам бальшавіцкага ЦК КПП вядуць упартае змаганьне супроць фашысцкай дыктатуры, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне пад лёзунгам «самавызначэньня аж да аддзяленьня», за Савецкую Польшчу.

Партактыў вітае гэраічную Кітайскую кампартыю і слаўную Кітайскую Чырвоную армію і іх барацьбу супроць сусьветных драпежнікаў. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі гэраічная Чырвоная армія Кітая кожны дзень упартай барацьбой з кітайскай рэакцыяй і яе дапаможнікамі — сусьветнымі імпэрыялістамі, крок за крокам нашырае савецкую тэрыторыю. Разьвіваюцца і ўмацоўваюцца на вызваленых тэрыторыях Кітая саветы, расьце рэвалюцыйны ўплыў кітайскай рэвалюцыі сярод калёніяльных народаў Далёкага Ўсходу.

Партактыў г. Менску шле свае гарачае пралетарскае прывітаньне слаўнай нямецкай кампартыі і яе правадыру тав. Тэльману, якая вядзе гэраічнае змаганьне супроць капіталу.

У абстаноўцы магутнага ўздыму рэвалюцыйнага руху, нарастаньня працівасьлак рэвалюцыйнага крызісу ў Польшчы і Нямеччыне, — буржуазія насаджае і абвастрае фашысцкі рэжым — аголеную форму буржуазнай дыктатуры для разгрому рэвалюцыйных арганізацый пралетарыяту і сялянства і ўдушэньня рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху.

Асабліва шалее белы тэрор у фашысцкай Польшчы, дзе гаспадарчы развал набывае катастрафічны характар і ў якой надзвычайны народы акупаванай Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны пад кіраўніцтвам КПП, КПЗБ і КПЗУ, пры актыўным падтрыманьні працоўных мас Польшчы, імкнуцца да вызваленьня з-пад ярма беднапольскай акупацыі.

Для задушэньня нацыянальна-вызваленчага руху працоўных мас Заходняй Беларусі, польскія акупанты імкнуцца ва што-б там ні стала справакаваць працоўныя масы ЗБ і стварыць шляхам правакацыі ўгрунтаваньне для шалёнага абвастрэньня тэрору, паўтарэньня крывавага «пацыфікацыйнага», «уміраварыцельнага» разгулу паліцэйшчыны ў выглядзе новых карных экспэдыцый, каб такім чынам патапіць у моры крыві беларускую вёску і горад з мэтаю фізычнага зьнішчэньня авангарду рабочае клясы — КПЗБ і падрыхтаваць пляцдарм для інтэрвэнцыі супроць СССР.

Актыўнымі дапаможнікамі імпэрыялістаў ва ўдушэньні рэвалюцыйнага руху у краінах капіталу зьяўляюцца сацыял-фашысты і нацыянал-фашысты. Гэтыя прывасьні капіталу з усіх сіл стараюцца дапамагаць капіталізму ў расправе з рэвалюцыйным рухам, дапамагаюць фашызацыі капіталістычных дзяржаў. Сацыял-дэмакратыя ператварылася ў галоўную апору дыктатуры буржуазіі ў яе барацьбе з пралетарыятам.

Пленум паказаў, што брацкія кампартыі на ўсім сьвеце значна вырасьлі і умацаваліся ў рэвалюцыйнай барацьбе і маюць рад сур'ёзных посьпехаў.

Кансалідацыя сэкцый Камінтэрну адбывалася на аснове пасьпяховай барацьбы супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, а таксама «левага» апартунізму і прымірэнцтва да ўхілаў ад ленінскай лініі. Барацьба супроць правага і «левага» апартунізму і прымірэнцтва да іх у далейшым павінна зьяўляцца галоўнай задачай сэкцый.

Але побач з посьпехамі пленум зусім правільна адзначыў і рад недахопаў у рабоце сэкцый Камінтэрну, галоўным з якіх зьяўляецца — адставаньне некаторых сэкцый Камінтэрну ад тэмпаў рэвалюцыйнага ўздыму. Ліквідацыя гэтага адставаньня павінна стаць аднэй з важнейшых задач Камінтэрну.

Пленум зусім правільна паставіў перад усімі кампартыямі задачу заваяваньня большасьці рабочае клясы, як неабходную ўмову для перамогі пралетарыяту ў надыходзячых рашаючых бароў за дыктатуру пралетарыяту, як галоўную і рашаючую задачу.

Сучасны эканамічны крызіс, які перажываецца капіталістычным сьветам, павінен быць скарыстаны кампартыямі для рэвалюцыянізаваньня працоўных мас, для мабілізацыі іх на барацьбу за рэвалюцыйнае вырашэньне крызісу. Усё гэта патрабуе рашучай барацьбы ў радох партый з правай небясьпекай, як галоўнай на даным этапе, з «левым» апартунізмам, з хвасьцізмам, пасыўнасьцю і сэктанцтвам.

Супярэчнасьці паміж сьветам капіталістычным і сацыялістычным, як ніколі, абвастрылі небясьпеку ваеннай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу. Таму зараз ад усіх кампартый патрабуецца самая рашучая барацьба супроць імпэрыялістычнай вайны і падрыхтоўкі ваеннай інтэрвэнцыі супроць першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы—СССР.

Партактыў г. Менску перад тварам усё ўзрастаючай небясьпекі ваеннай інтэрвэнцыі СССР заяўляе ЦК КП(б)Б, ЦК УсеКП(б), Камінтэрну і ўсяму сусьветнаму пралетарыяту, што прыкладзе ўсе свае сілы, энэргію на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, на пабудову сацыялізму, на ўзмацненьне абароназдольнасьці савецкай краіны, на перамогу Кастрычніка ва ўсім сьвеце.

Актыў менскай гарадзкой арганізацыі заклікае ўсіх членаў КП(б)Б, ЛКСМБ, усіх рэвалюцыйных рабочых, калгаснікаў БССР найбольш уважліва вывучыць пастановы XI пленуму ВККІ, павысіць сваю работу ў галіне інтэрнацыянальнага выхаваньня; азнаямленьня са становішчам і барацьбой братоў па клясе ў капіталістычных краінах, узмацненьня работы ў радох МОПР'у.

СТАНОВЯЦЦА У СТРОЙ

70 тэарытычна падрыхтаваных ленінцаў

Камуністычны ўнівэрсытэт Беларусі імя Леніна дае КП(б)Б новыя кадры работні

Бальшавіцкае прывітаньне выпускнікам

НЯСЕЦЕ ВЕДЫ ЛЕНІНІЗМУ Ў ШЫРОКІЯ МА

ГАРАЧАЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ВЫПУСКНІКАМ — ВУЗАЎЦАМ. НЯСЕЦЕ ЗДАБЫТЫЯ ВАМІ ВЕДЫ ЛЕНІНІЗМУ Ў ШЫРОКІЯ МАСЫ. НЯ СПЫНЯЙЦЕСЯ НА ТЫМ, ШТО ВЫ АТРЫМАЛІ Ў СЬНЕ КАМВУЗУ, ПРАЦУЙЦЕ І Ў ДАЛЕЙШЫМ НАД АЎЛАДАЎНЬНЕМ МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫІ.

БУДЗЬЦЕ НЕ АНОНІМНІМІ ЗМАГАРАМІ НАШАЙ ПАРТЫІ НА ФРОНТЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ І Ў БАРАЦЬБЕ З АДХІЛЕНЬНЯМІ АД ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ НАШАЙ ПАРТЫІ.

І ТАК — ЗА ПРАЦУ!

САКРАТАР ЦК КП(б)Б ГЕР

На перадавыя пазіцыі

Сёньня датэрмінова выпускаецца з Камвузу 70 студэнтаў, якія накіроўваюцца на адказныя вучасткі партыйнай работы. Разам з гэтым адбываецца чарговы выпуск 18 чалавек вячэрняга сэктару КУБ'у.

Семдзесят і восемнаццаць. Толькі такімі лічбамі адказвае наш Камвуз на запатрабаваньні даць кіруючыя партыйныя кадры для нізавых і сярэдніх зьвеньняў КП(б)Б. Сёньнешні выпуск асноўнага і вячэрняга сэктароў КУБ'у — ёсьць перадапошні выпуск са старых мінімалісцкіх набораў Камвузу. Толькі дзесяткамі адказваем на патрэбныя сотні.

Гэта акалічнасьць ускладае на кожнага выпускніка вялікі партыйны абавязак працаваць з удзесяцяронай напружанасьцю энэргіі на тых вучастках, дзе паставіць іх партыя. З гэтай задачай выпускнікі змогуць справіцца, калі яны ня будуць байцамі-адзіночкамі, а стануць сапраўднымі арганізатарамі партыйных мас і праз іх мабілізуюць масы беспартыйнага актыву працоўных на выкананьне задач партыі.

«ПАЛІТЫКА БЯЗ МАС — АВАНТУРНАЯ ПАЛІТЫКА. ДУМАЦЬ, ШТО САЦЫЯЛІЗМ МЫ МОЖАМ ПАБУДАВАЦЬ РУКАМІ АДНЫХ КАМУНІСТАЎ — ДЗІЦЯЧАЯ, ЗУСІМ ДЗІЦЯЧАЯ ІДЭЯ».

Гэтыя ленінскія палажэньні зьяўляюцца асноўнымі правіламі для камуністычных кіраўнікоў у справе сацыялістычнага будаўніцтва і клясавай барацьбы.

Нарастаючае абвастрэньне клясавай барацьбы ў выніку разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, змаганьне за выкананьне задач, якія пастаўлены партыяй у даны пэрыяд сацыялістычнага будаўніцтва, з усёй вострасьцю паставілі пытаньне аб ленінска-вытрыманых кіраўнікох у розных галінах работы. Але-ж тыя самыя абставіны, якія параджаюць гопад на кадры, крыюць у сабе і даюць поўную магчымасьць вырашэньня праблемы кадраў. У барацьбе з клясавым ворагам, у барацьбе на два фронты за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі выхоўваюцца новыя бальшавіцкія кадры ў масавым маштабе.

Рэвалюцыйная барацьба патрабуе кадраў, кадры ствараюцца рэвалюцыйнай барацьбой. Невялічкі атрад з 88 — можа стаць вялікім атрадам бальшавікоў, калі выпускнікі будуць сапраўднымі арганізатарамі мас, а не байцамі-адзіночкамі. «ПАРТЫЯ НАША МАГУТНА І НЕПЕРАМОЖНА ТАМУ, ШТО ЯНА, КІРУЮЧЫ РУХАМІ, УМЕЕ ЗАХОЎВАЦЬ І МНОЖЫЦЬ СВАЕ СУВЯЗІ З МІЛЬЁНАМІ МАС РАБОЧЫХ І СЯЛЯН» (Сталін).

Разам з усёй КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, выпускнікі праходзілі суровую школу тэарытычнай і практычнай барацьбы за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. У гэтай школе, змагаючыся на два фронты, выпускнікі атрымалі магчымасьць большага аўладаньня зброяй марксыцка-ленінскай тэорыі. Гэта зброя будзе выкарыстана ў змаганьні за пасьляховае выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Выкананьне вялікай праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі — 45 проц. калектывізацыі, баявая задача поўнага выкананьня бальшавіцкай сяўбы бягучай вясны, выкананьне плянаў будаўніцтва і прамфінпляну, ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі — патрабуе ад выпускніноў вострай бальшавіцкай пільнасьці, рашучай барацьбы з клясавым ворагам і ўхіламі ад ленінскай лініі партыі.

У выкананьне гэтых задач выпускнікі-камвузаўцы павінны быць і будуць пешшай баявой брыгадай КП(б)Б.

САЕВІЧ.

Вучыце масы і самі вучыцеся ў мас

Выпускнікам дзеннага і вячэрняга Камвузу—шчырае бальшавіцкае прывітаньне.

Перад Вамі стаіць задача—злучыць тэарытычныя веды з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва і па гэтай рабоце правяраць сябе, як змагароў за сацыялізм.

Памятайце, што за дзесяць год мы павінны дагнаць і перагнаць капіталістычны сьвет. Этап вялікіх работ патрабуе абавязковага аўладаньня тэхнікай. Упарта змагайцеся за разьвіцьцё прадукцыйных сіл нашай сацыялістычнай гаспадаркі, змагайцеся за якасныя паказальнікі ў прамысловасьці, за хвасьцізмам, пасыўнасьцю і сэктанцтвам.

Супярэчнасьці паміж сьветам капіталістычным і сацыялістычным, як ніколі, абвастрылі небясьпеку ваеннай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу. Таму зараз ад усіх кампартый патрабуецца самая рашучая барацьба супроць імпэрыялістычнай вайны і падрыхтоўкі ваеннай інтэрвэнцыі супроць першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы—СССР.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б КАВАЛЬЧУК.

Група выпускнікоў камвузаўцаў-брыгадзіраў «Зьвязды»

Рапартуюць выпускнікі

Камвуз імя Леніна—адзіная вышэйшая школа ў БССР па падрыхтоўцы кіруючых кадраў для КП(б)Б—сёньня пасылае на непасрэдную практычную работу на розных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва 70 таварышоў, узброеных марксыцка-ленінскай тэорыяй, якія з бальшавіцкай пастойлівасьцю будуць весьці барацьбу за генэральную лінію партыі ва ўсёй сваёй практычнай рабоце.

Гэты выпуск камвузаўцаў аьяўляецца яшчэ аднэй перамогай на фронце падрыхтоўкі партыйных кадраў. Датэрміновы выпуск студэнтаў Камвузу, якія ў пераважнай большасьці накіроўваюцца на працу ў вёску—зьяўляецца вялікай дапамогай мясцовым партыйным арганізацыям у іх рабоце па ажыцьцяўленьні генэральнай дырэктывы ЦК КП(б)Б—30 проц. калектывізацыі ў весновую пасеўкампанію і 45 проц. восені.

Задачы, якія высоўваюцца перад усімі арганізацыямі, [illegible] быць пасьпяхова вырашаны толькі усілкі адхіленьнямі і скажэньнямі генэральнай лініі партыі, у барацьбе з ленінскую нацыянальную палітыку, барацьбе з усілкі скажэньнямі [illegible] вялікадзяржаўным шавінізмам [illegible] лоўная небясьпека на даным [illegible] контр-рэвалюцыйным беларускім [illegible] цыянал-дэмакратызмам і шкід[illegible] ўсіх колераў.

Ударнікамі гэтай барацьбы [illegible] зьяўляцца новыя ленінскія кадры загартаваны і ўзброены марксыцка-ленінскай тэорыяй.

Бальшавіцкае прывітаньне новым кадрам ленінцаў!

Культпроп ЦК КП

Бальшавіцкае прывітаньне новым кадрам ленінцаў

Камвуз імя Леніна—адзіная вышэйшая школа ў БССР па падрыхтоўцы кіруючых кадраў для КП(б)Б—сёньня пасылае на непасрэдную практычную работу на розных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва 70 таварышоў, узброеных марксыцка-ленінскай тэорыяй, якія з бальшавіцкай пастойлівасьцю будуць весьці барацьбу за генэральную лінію партыі ва ўсёй сваёй практычнай рабоце.

Гэты выпуск камвузаўцаў аьяўляецца яшчэ аднэй перамогай на фронце падрыхтоўкі партыйных кадраў. Датэрміновы выпуск студэнтаў Камвузу, якія ў пераважнай большасьці накіроўваюцца на працу ў вёску—зьяўляецца вялікай дапамогай мясцовым партыйным арганізацыям у іх рабоце па ажыцьцяўленьні генэральнай дырэктывы ЦК КП(б)Б—30 проц. калектывізацыі ў весновую пасеўкампанію і 45 проц. восені.

Задачы, якія высоўваюцца перад усімі арганізацыямі, [illegible] быць пасьпяхова вырашаны толькі усілкі адхіленьнямі і скажэньнямі генэральнай лініі партыі, у барацьбе з ленінскую нацыянальную палітыку, барацьбе з усілкі скажэньнямі [illegible] вялікадзяржаўным шавінізмам [illegible] лоўная небясьпека на даным [illegible] контр-рэвалюцыйным беларускім [illegible] цыянал-дэмакратызмам і шкід[illegible] ўсіх колераў.

Ударнікамі гэтай барацьбы [illegible] зьяўляцца новыя ленінскія кадры загартаваны і ўзброены марксыцка-ленінскай тэорыяй.

Бальшавіцкае прывітаньне новым кадрам ленінцаў!

Культпроп ЦК КП

Камвузавец аб са

Тры гады правучыўся ў Вячэрнім Камвузе. Вельмі цяжка было, бо мая агульная падрыхтоўка была слабавата. У вучобе не хацелася адставаць ад таварышоў. Усе сілы намагаў каб асіліць цяжкасьці ў гэтай справе.

Трохгадовая вучоба дала многае. Я зараз самастойна магу разьбірацца з творамі Леніна і добра ўяўляю, што нягод работа вячэрняга сэктару пекальні пагоршылася. Частяюцца выкладчыкі за заняхвіл., а то і на гадзіну. З дку—з прычыны пераспарадчастрацы вячэрняга Камвузу, час зьяўлялася па чатыры вы

Партколектыву трэба па г дахопы зьвярнуць увагу.

Х. Г. Бэр

і ў далейшым напаўняць і зам Лічу неабходным стварэньне сыцка-ленінскіх гурткоў пры комуністычнай асьветы. Трэба як адзін раз у месяц склікаць ванцы гэтых гурткоў.

Адзначаючы вялікую ролю ў справе падрыхтоўкі партыйраў, трэба заўважыць, што з год работа вячэрняга сэктару

Прэміі за арганізацыю корму з гальля

Мы ўжо паведамлялі, што ў саўгасе Малая Сьляпянка ў канцы красавіка была праведзена першая вопытная загатоўка корму з гальля.

Вопыты былі зроблены пры вельмі ня спрыяючых умовах. Сілосарэзка была паламана і патрабавала капітальнага рамонту. Брыгада рэдакцыі «Зьвязды» разам з прыехаўшым спэцыялістым з Масквы не магла прыступіць да работы. Толькі дзякуючы настойлівасьці і энэргіі кам гасу т. Дзяржынскага, які звышнармова два

ВОЛЬНЫ АПЭРАТЫЎНАГА КІРАЎНІЦТВА сяўбой

Кожная брыгада, зьвяно і калгасьнік павінны ведаць нормы выпрацоўкі. Весьці дакладны вучот працы калгасьнікаў

Апартуністы з Буда-Кашалеўскага раёну прыкрываюць падзёншчыну папяровай зьдзельшчынай

Адсутнасьць вучоту і папяровая зьдзельшчына зрываюць сяўбу

Дырэктывы савецкіх і калгасных органаў аб пераходзе на зьдзельшчыну катэгарычныя і зразумелыя. Да пачатку сяўбы на зьдзельшчыну павінны былі быць пераведзены ўсе калгасы. Між тым, паводле вестак Калгасцэнтру на 6 мая на зьдзельшчыну пераведзена толькі 4.500 калгасаў або 68 проц. усіх калгасаў БССР. Такім чынам мы маем нелюдзкальнае адставаньне з увядзеньнем зьдзельшчыны ў калгасах.

Асноўная прычына слабога ўкараненьня зьдзельшчыны ў большасьці раёнаў заключаецца ў праваапартуністычных адносінах да гэтай важнейшай задачы. На мясцох усё яшчэ паглядзецца недаацэнка кампаніяльнага значэньня зьдзельшчыны, як асноўнага мэтаду арганізацыі працы ў калгасах, найлепшага спосабу забесьпячэньня посьпеху сяўбы, павышэньня прадукцыйнасьці працы, барацьбы з гультайствам, прыхадам на работу і г. д.

З раду месц паступаюць весткі аб агідных скажэньнях увядзеньня зьдзельшчыны. Есьць рад фактаў фармальнага пераводу на зьдзельшчыну: на паперы зьдзельшчына, а на справе падзёншчына (Жыткавіцкі, Дубровенскі і інш. раёны). Так, нормы выпрацоўкі ўстаноўлены, ацэнка работы ў працадзёх зроблена, створаны брыгады, але калгасьнік ня ведае ні норм, ні ацэнкі, ні работы, якую ён павінен рабіць.

У радзе калгасаў выключна дрэнна паставлен улік працы. Працадні не запісваюцца ў працоўныя кніжкі калгасьнікаў, не вядзецца ўліку, на якім можна было-б бачыць, якая колькасьць дзён выпрацавана кожным калгасьнікам. Такое становішча ўліку працы зрывае ўкараненьне зьдзельшчыны, зьніжае працоўную дысцыпліну і ставіць пад пагрозу свячасовае выкананьне плану сяўбы ў калгасах.

Неабходна адпачаць злачынныя адносіны Арбуду да выкананьня заказаў Калгасцэнтру на надрукаваньні форм ўліку працы і працоўных кніжак для калгасаў. Толькі 8-га мая з Гомеля накіраваны па калгасах бланкі парадаў, а працоўныя кніжкі Арбуд абяцае выслаць толькі праз тыдзень. Калгасцэнтрам гэта справа перадана пракуратуры для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Калгасцэнтр у сваёй настанове прапануе ўсім райкалгассаюзам закончыць пераводзе на зьдзельшчыну калгасаў да 15-га мая. Нормы выпрацоўкі павінны быць даведзены да кожнага калгасьніка.

Райкалгассаюзам запрапанавана ўстанавіць вучот працы ў калгасах з такім разьлікам, каб штодзенна калгасьніку запісваліся працоўныя дні ў працоўную кніжку і каб кожныя 5 дзён па відным месцы ў калгасе вывешваліся іменныя сьпісы прапрацаваных дзён кожным калгасьнікам. Гэтыя сьпісы павінны вывешвацца на працягу ўсёй веснавой сяўбы.

Калгасцэнтрам мабілізаваны ўвесь інструктарскі і рахункаводны апарат для дапамогі райкалгассаюзам па ўвядзеньні новых форм ўліку працы.

Адсутнасьць правільнага ўліку працы пагражае ня толькі зрывам увядзеньня зьдзельшчыны, але і сур'ёзна пагражае ходу сяўбы. На гэты вучастак павінна быць зьвернута ўвага ўсёй раённай грамадзкасьці.

Калгасаюзы павінны прыняць тэрміновыя меры для забесьпячэньня калгасаў бланкамі ўліку і працоўнымі кніжкамі.

Да 15-га мая засталося мала часу. Дырэктыва Калгасцэнтру аб поўным пераводзе ўсіх калгасаў на зьдзельшчыну да гэтага тэрміну павінна быць безагаворачна выканана.

Апартуністычнай недаацэнцы і скажэньням зьдзельшчыны трэба палажыць канец.

Барацьба за фінплян—барацьба за пяцігодку ў чатыры гады



Піянэры за ачысткай насеньня

Баярскі сельсавет—савет суцэльнай калектывізацыі

Поўнасьцю замацаваць новаарганізаваныя калгасы

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

Сталінскі калгасны прызыў у Полацкім раёне даў значны прырост калектывізацыі. Зараз Полаччына на сваёй тэрыторыі мае 94 калгасы, 35 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па раёне калектывізавана. Кожны новы дзень прыносіць весткі аб арганізацыі новых калгасаў і папаўненьні старых.

Дзякуючы бальшавіцкай настойлівасьці партыйнай арганізацыі, у **Баярскім** сельсавеце на сёнешні дзень завершана суцэльная калектывізацыя ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак сельсавету. З 357 гаспадарак, з якіх 16 абкладзены цьвёрдымі заданьнямі, калектывізавана 330 гаспадарак, што складае 98,5 проц.

Падыходзіць да суцэльнай калектывізацыі **Юраўцкі** сельсавет, які калектывізаваны на **50,2** проц., **Васілеўскі**—на **50 проц.**, **Алесаўскі**—на **51,3** проц. **Бельскі** сельсавет да сяўбы ідзе на шляху завяршэньня суцэльнай калектывізацыі, на сёнешні дзень ён калектывізаван на **75,9 проц.**

Поруч з гэтым у **Семянецкім** і **Тураўлянскім** сельсаветах процант калектывізацыі не перавышае. **5.**

Баярскі сельсавет суцэльнай калектывізацыі сустракае сяўбу падрыхтаваным. Пасеўныя плошчы даведзены да ўсіх калгасаў і калгасьнікаў. Вытворчыя пляны па ўсіх калгасах складзены.

Зараз у гэтым сельсавеце шырока разгорнута работа па ўвядзеньні ў калгасах зьдзельшчыны, больш паловы калгасаў перайшлі на зьдзельшчыну. Праводзіцца самаачыстка калгасаў ад кулацкіх і чужых элемэнтаў.

Усё-ж на радзе сельсаветаў раёну і партыйныя ячэйкі і сельсаветы не ўдзялілі выстарчальнай увагі гаспадарчаму замацаваньню новаарганізаваных калгасаў, у выніку чаго наглядаецца злачынна недапушчальны зьвяшчы, калі гэтыя калгасы развальваюцца. Неабходна поўнае арганізацыйнае і гаспадарчае замацаваньне новаарганізаваных калгасаў і ўвядзеньне зьдзельшчыны па ўсіх калгасах раёну.

А. Шустры.

Кіраўніцтва Буда-Кашалёўскага раёну—у цяньку габінэтаў

СЯЎБА ПРАДАСТАЎЛЕНА САМАЦЁКУ

Замест укараненьня зьдзельшчыны займаюцца экспэрымэнтамі

БУДА-КАШАЛЕЎ, 9. (Наш спэцкар.). У Буда-Кашалёўскім ужо разгорнута масавая сяўба яравых, якая згодна пастановы ўрадавых органаў павінна скончыцца да 25 мая. Аднак, праваапартуністычная бязьдзейнасьць раённых арганізацый стварае пагрозу, што гэта дырэктыва ня будзе выканана.

Зьдзельшчына ў калгасах праведзена кампанійскім парадкам і фармальна. Мабілізавалі на пэўны час раённы актыў для пераводу калгасаў на зьдзельшчыну, сьпісалі прыкладныя нормы Беларгасцэнтру і на гэтым супакоіліся.

Есьць рад выпадкаў неразуменьня сутнасьці зьдзельшчыны. Так у калгасе імя Сталіна № 2 старшыня калгасу сказаў, што нормы выпрацоўкі могуць ужывацца толькі ў буйных калгасах, а калгас імя Сталіна № 2—дробны, значыцца зьдзельшчыны ўкараняць тут ня варта. У калгасе «Шлях да сацыялізму» заявілі, «што нормы выпрацоўкі мы ўстановім тады, як папрацуем на полі і ўбачым, колькі магчыма выпрацаваць».

У выніку такіх калгасы плятуцца ў хвосьце пасеўнай кампаніі. Калі суседні калгас «Трактарыст», у якім правільна разумеюць зьдзельшчыну, ужо канчае сяўбу ранніх культур, дык у калгасах імя Сталіна № 2 і «Шлях да сацыялізму» яшчэ толькі возяць гной пад гэтыя культуры, бо калгасьнікі ня ведаюць, колькі яны павінны выпрацаваць і за што яны працуюць, прадукцыйнасьць працы нізкая, на работу прыходзяць позна.

Інвэнтар і цягавая сіла да пэўных працаўнікоў не прымацаваны, бо ліквідаваньнем абязьлічкі ніхто ня цікавіцца, у выніку чаго нездавальняюча дагледаецца жывёла, інвэнтар раскідваны (калгас «Ураджай»).

У калгасе «Інтэрнацыянал» не растлумачана сутнасьць ацэнкі працы ў працадзёх і зьдзельшчыны. Калгасьнікі кажуць: «у мінулым годзе атрымаў больш той, хто менш працаваў. Так і сёлета будзе, ня ведаем, за што працуем». І зразумела, што ўдарніцтва і сацыяборніцтва ў гэтым калгасе не зьяўляецца штодзённым мэтадам працы.

Позьняя вясна патрабуе максымальнага ўпучыльненьня тэрмінаў сяўбы. Аднак гэтага не разумеюць у Буда-Кашалёўскім раёне. Адозва калгасу «Гудок» аб упучыльненьні тэрмінаў сяўбы не падтрымана. Наадварот, маюцца нават такія факты, калі калгас «Перамога» в мая спраўляў кірмаш, усе калгасьнікі п'янствавалі на чале з праўленьнем. Ня гледячы на гарачы час работы, па ўсіх калгасах уживаюцца выхадныя дні.

Брыгады пабудаваны няправільна. Брыгадай тут звычайна лічаць усю палявую сілу і яны грамоздкія, непаваротлівыя. Брыгады не разьбіты на зьвёны і не атрымліваюць канкрэтных заданьняў на палявыя работы. Ня маючы брыгаднага заданьня, нельга праводзіць сацыяборніцтва, бо няма магчымасьці праверыць работу брыгады.

Стан цягавай сілы па некаторых калгасах раёну пагражае свячасоваму скасьленьню сяўбы яравых.

У калгасе «Інтэрнацыянал» да таго запусьцілі конай, што гэтыя коні не працуюць больш 3-4 гадзін у суткі. Такое-ж становішча з цягавай сілай і ў калгасе «Ураджай».

Пра корм з гальля тут гавораць, што «ад дрова наша жывёла падохла-б».

У выніку праваапартуністычнай бязьдзейнасьці райкаансэзыу, калгасы не забяспечаны с.-г. машынамі, неабходнымі для веснавой сяўбы.

На складах ляжаць на 40.000 руб. машын. Горамі ляжаць бороны «Зігзаг», плугі «Сака», сеялкі і такучкі, а ў калгасах («Шлях да сацыялізму», імя Сталіна) няма радзімых сеялак, аруць старымі страдаўшымі плужкамі, якія не даюць магчымасьці паскорыць тэмпы сяўбы і палепшыць якасьць працы.

На складзе райкаансэзыу пагніла віка і таму плян пасеву **трэ** таксама зрываецца. Калгас «Шлях да сацыялізму» ссе пасаваным насеньнем. Ня гледячы на катэгарычныя прапановы ўраду аб скапчэньні кантрактацыі збожжавых да 15 красавіка і тэхнічных—да 5 мая, у Буда-Кашалёве гэта дырэктыва ня выкавана. На 8 мая закантрактавана на збожжавых 60 проц., на тэхнічных толькі 58 проц., прычым, гэтыя лічбы выкананы, галоўным чынам, за лік калгасаў. Напрыклад, па гатунковым аўсу калгасы выканалі на 114 проц., а індывідуальны сэктар—0 проц., па ільне—калгасы 101 проц., індывідуальны сэктар—толькі 35 проц., па ячмені—калгасы 148, індывідуальны — 50 проц.

Гэтыя факты відавочна сьведчаць аб тым, што работа па кантрактацыі ў Буда-Кашалёўскім раёне, асабліва ў індывідуальным сэктары, не вялася. РСІ патрэбна прыцягнуць да адказнасьці канкрэтных вінаватых.

На 8 мая ў раёне няма ніякіх зьвестак аб ходзе сяўбы. Сельсаветы, карыстаючыся бязьдзейнасьцю РВК, зьвестак аб ходзе веснавой пасеўнай кампаніі не даюць, а таму невядома дзе што патрэбна рабіць.

Райарганізацыі, на чале з райкомам КП(б)Б, праяўляюць праваапартуністычную бязьдзейнасьць, не надаючы належнай увагі справе веснавой сяўбы. Усе работнікі райўстаноў пахваляліся ў цынёк сваіх габінэтаў, не жадаючы ехаць у калгасы дапамагчы ліквідаваць прарывы на пасеўным фронце, пяпячыся ў хвасьце, аддаўшы жывую справу на самацёк.

П. Арцельны.

На III усебеларускім зьезьдзе чыгуначнікаў

ВЫРАЗНАЙ РАБОТЫ,

ЦЬВЁРДАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ І АДКАЗНАСЬЦІ ЗА ДАРУЧАНУЮ РАБОТУ

патрабуюць дэлегаты зьезду ад кожнага работніка транспарту

Транспартнай каапэрацыі неабходна канкрэтная дапамога з боку ўсіх чыгуначных арганізацый і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці

Пастановы зьезду—у масы чыгуначнага пралетарыяту. Змагацца за неадкладнае іх ажыцьцяўленьне

З вялікай увагай дэлегаты слухалі даклады ўшаноўванага Наркамшляху на БССР тав. **Папюдава** і аб рабоце ТСТ тав. **Бурачэўскага.** Гэта зразумела. Выкананьне вымаральнікаў праходзіць дрэнна. Не на вышыні і работа каапэрацыйнай сеткі.

Кандуктар Аршанскага вузла тав. **Евус** гаворыць:

— Крушэньні цягнікоў можна зьнішчыць ударнай работай кандуктарскіх брыгад. У нас па вузьле там, дзе кандуктары узяліся сапраўды за работу, значна скараціліся ударэньні.

— Завод «Полымя рэвалюцыі»—гаворыць дэлегат **Куневіч** — выконвае плян ня больш, чым на 80 проц. Але ніколі да нас не заглядваюць прадстаўнікі дырэкцыі чыгункі, каб высьвятліць прычыны. Завод пераходзіў у ведама ВСНГБ, а зараз зноў у ведама чыгункі. Гэта вымагала адпаведнай перабудовы цэхаў, але дапамогі ад цэнтру ніякай ня было.

Тав. **Куневіч** прыводзіць прыклад, як няўважліва дырэкцыя дарогі адносіцца да падбору дырэктароў, якіх яна пасылае на чыгунку.

— На завод «Полымя рэвалюцыі» прыбыў дырэктар, праз два дні ўехаў у Маскву. Праз месяц ён зноў зьявіўся на завод і заявіў:

— Не ўдалося выкруціцца ад работы на заводзе...

— Пасядзеўшы крыху на заводзе, ён зноў укаціў. А завод без кіраўніка працуе.

Палепшыць работу дыспэтчарскага складу

Дэлегат з Асіпавіч тав. **Сакініч** гаворыць аб няўважлівых адносінах да работы, нераспарадчасьці дыспэтчараў.

— Вельмі часта пасылаюцца рэзэрвовыя брыгады ў Менск, якія суткі сядзяць там, нічога ня робяць і вяртаюцца назад. Бываюць і такія выпадкі, калі на нераспарадчасьці дыспэтчара, або дзяжурнага няправільна складаюцца цягнікі, а потым на кожнай станцыі прыходзіцца разрываць саставы, ад чаго разьбіваюцца вагоны.

Многія з дэлегатаў у сваіх выступленьнях гаварылі аб тым, што дзяжурныя па станцыі і дыспэтчары мала працуюць, 5 гадзін уходзіць на прыём і здачу дзяжурстваў, а на работу заставецца толькі тры гадзіны. Ад такой пастаноўкі справы церпіць правільнае разьмеркаваньне руху цягнікоў, свячасовае адпраўленьне і г. д.

Тая работа дыспэтчарскага апарату, якая была да гэтага часу, ня можа быць цярпіма ў далейшым. Вагоны ўходзілі недагружанымі. У адзін дзень на станцыі зьбіраліся на 10 цягнікоў, загружалі ўсе пуці, а былі такія дні, калі на раскладзе павінны прыбываць цягнікі, але ня прыбывалі таму, што нідзе не забясьпечылі свячасовай нагрузкі і адпраўкі.

— Ад нявыразнасьці работы дыспэтчарскага апарату краіна церпіць тысячы рублёў страт,—гаворыць дэлегат Жлобіна тав. **Аляксандраў.**

Зьнішчыць абязьлічку ў рамонце

— У нас яшчэ—гаворыць дэлегат з Віцебска тав. **Прохараў**—вялізарнейшы процант паўторнасьці рамонту. Гэта таму, што вялікая колькасьць брыгад рамантуе адзін і той-жа паравоз, а адказных асобы няма. Цяжка ўстанавіць, якая брыгада дрэнна адносіцца да якасьці рамонту. Трэба зьнішчыць абязьлічку ў рамонце так, як мы зьнішчаем яе на паравозе.

Многія дэлегаты (тав. Прохараў і інш.) расказваюць аб тым, што калі на складах ёсьць вугаль трох гатункаў, дык у першую чаргу выкарыстоўваюць лепшы, а горшы вугаль пакідаюць на пасьля.

Дэлегаты з Віцебска расказваюць, як лепшыя машыністы прапанавалі сартаваць вугаль усіх гатункаў. Але адміністратары не далі адказу на іх прапановы.

— Мы таксама многа займаліся пытаньнямі апалу—гаворыць дэлегат з Гомеля тав. **Данкевіч**—звараталіся да інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу, але нам адказалі: «Уся наша ўвага зьвернута на падрыхтоўку кадраў, нам няма калі займацца пытаньнямі рацыянальнага выкарыстаньня апалу».

Зразумела, падрыхтоўка кадраў зьяўляецца важнейшым вучасткам нашай работы. Усё-ж лічым патрэбным прыпомніць інжынэрам і тэхнікам Гомеля, што ня трэба адрываць падрыхтоўку кадраў ад выкананьня тых задач, якія пастаўлены зараз партыяй і ўрадам перад транспартам.

Перамогі ст. Езерышчы

На трыбуне дэлегата з далёкай станцыі **Езершчыны** тав. **Андрэева.** Яна першы раз выступае перад вялікай аўдыторыяй. Андрэева просіць зьезд выслухаць тое, што прасілі ўдарнікі станцыі перадаць аб іх змаганьні за выкананьне вымаральнікаў:

— Мы свой плян выконваем поўнасьцю, па некаторых паказальніках нават з перавышэньнем. За кожным паравозам замацаваны машыністы, памочнікі і качагары. Зрываў спаранай язды ня было. Дабіліся мы поўнага выкананьня вымаральнікаў толькі таму, што наладзілі работу вытворчых нарад. Плян давялі да кожнага выканаўцы. Кожнага прагульшчыка і п'яніцу б'ем праз насьценгазэту. Нашымі рабочымі праводзіцца работа і ў вёсны. І таму вёска Езерышчы калектывізавана на 75 проц.

Тав. **Драйчык** (завод імя Ланцуцкага) расказвае, што яшчэ ня скончаны заказы ВСНГБ таму, што ён не дае матар'ялаў. Цэхі завалены камядрабілкамі і няма магчымасьці рамантаваць вагоны.

— Калі наш завод, кажа т. Драйчык, быў перададзены ў веданьне ВСНГ, апошнім былі ўзяты нашы інструманты заводу. Зараз мы засталіся бяз інструментаў, няма з чым працаваць, але адміністрацыя заводу ня ўсё яшчэ зрабіла для таго, каб забясьпечыць завод патрэбнымі матар'ялам і інструментамі для рамонту вагонаў.

Дэлегат ад ст. Вычыха тав. **Шкрэдаў** кажа аб тым, што неабходна і на рамонт **вагонаў** зьвярнуць таксама сур'ёзную ўвагу.

— Сапраўды трэба разгрузіць шляхі станцый ад вагонаў. Мы крычым аб недахваце паражняка, у той час як на ст. **Бычыха** 40 вагонаў займаюць месца і не выкарыстоўваюцца. Такое-ж становішча і на ст. **Негарэлае**, дзе цэлыя саставы паражняка літэральна занялі ўсе шляхі.

Дэлегаты расказвалі, што б. начальнік ст. Бычыха **Ванюкоў**, зьняты з работы за апартуністычную практыку, усё-ж такі прыходзіць да рабочых і вядзе падрыўную работу. Ванюкоў адзін раз заявіў рабочым—той, хто выдумаў пяцігодку, зьяўляецца яркім апартуністам. Ванюкоў атрымаў рашучы адпор з боку рабочых ударнікаў. Але гэта прымушае партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі мабілізаваць масы на барацьбу супроць тых, хто імкнецца падарваць работу чыгункі.

На барацьбу з безадказнасьцю

Дэлегат станцыі Гарадок тав. **Мінус** у сваім выступленьні расказаў аб агідных адносінах адміністратараў станцыі да даручанай справы.

У часе паводкі ў адным месцы на Гарадоцкай ветцы размыла пуць. 33 вагоны, нагружаныя лесаматар'ялам, засталіся ў лесе, там яны знаходзяцца і да сёнешняга дня.

На зьезьдзе выступілі з вялікімі прамовамі члены Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б т. **Будзінскі** і **Гантман.** У сваіх выступленьнях яны адзначалі, што рашучага пералому ў рабоце транспарту яшчэ няма. Вопыт работы лепшых прадпрыемстваў, якія выконваюць і перавыконваюць плян, павінен быць перанесен на транспарт.

Дэлегаты зьезду, раз'ехаўшыся на чыгуначных вузлах, павінны цесна зьвязацца з друкам і тым, каб разам з усімі ўдарнікамі біцца за укараненьне новых форм працы на транспарце, за выкананьне трансфінпляну на ўсіх вымаральніках. Праз друк неабходна выкрыць да канца апартуністычныя элементы, рэшткі шкоднікаў, якія перашкаджаюць будаўніцтву сацыялістычнага транспарту.

* * *

Многія дэлегаты гаварылі аб тым, што ТСТ яшчэ не перабудавала сваёй работы для бесьперабойнага абслугоўваньня рабочых чыгункі. Тав. **Матей** у сваім выступленьні гасарыў наступнае:

— Старшыня Гомельскага ПРК тормозіць работу на адлучэньні ТСТ ад ПРК. Яшчэ да гэтага часу не пераданы Гомельскаму вузлу сьвінаадкормачны пункт.

— З рук поп кепска пастаўлена забесьпячэньне праязных брыгад. На станцыях вельмі часта няма прадуктаў у той час, як на складах іх ёсьць у дастатковай колькасьці—гаворыць тав. **Прохараў.**

Гаварылі дэлегаты аб становішчы з забесьпячэньнем Гомельскага чыгуначнага тэхнікуму, у якім пучыцца 70 проц. выключна рабочых чыгуначнікаў.

Мы вучымся—кажа дэлегат **Нізаўцоў**—месяц у тэхнікуме і месяц на практычнай рабоце, на транспарце. Тэхнікум адлучылі ад ТСТ, а калі вучні працуюць на транспарце ім няма дзе харчавацца.

Кепска і з будаўніцтвам сеткі каапэрацыйных крам, сталовак. Няма яшчэ плянаў, чарцяжоў і галоўнае, адсутнічаюць будаўнічыя матар'ялы. Старшыня Аршанскага ТСТ тав. **Матаў** у сваім выступленьні заявіў:

— Дапамога з боку гаспадарнікаў, асобных прафсаюзных арганізацый у рабоце каапэрацыі далёка недастаткова. Адсутнічае кантроль і кіраўніцтва каапэрацыйнай сеткай на транспарце. Зьезд гэтай справе павінен палажыць канец. Толькі пры дапамозе ўдарнікаў і ўсіх арганізацый транспарту каапэрацыя зможа справіцца з ускладзенымі на яе задачамі.

512 прафшкольцаў Менскага чыгуначнага вузла прышлі з прывітаньнем III ўсебеларускаму зьезду. Ад імя прафшколы зьезду перадаў рапарт тав. **Русак:**

— З 512 чал. прафшкольцаў 508 зьяўляецца ўдарнікамі. Мы адпрацавалі на суботніку 5.000 чалавека-гадзін. У дзень 16-гадзьдзя камсамолу 111 чал. перайшла ў рады ленінскага камсамолу.

Мы патрабуем ад зьезду даць магчымасьць прафшкольцам больш займацца практыкай на транспарце. Мы абяцаем зьезду змагацца за выкананьне трансфінпляну. З сёнешняга дня мы зьвяшчаем паход за рацыяналізацыю.

Пасьля 3-хдзённай працы зьезд закрыўся. Пастановы зьезду павінны быць прапрацаваны на рабочых сходах цахаў, груп і брыгад, з тым каб неадкладна прыступіць да ажыцьцяўленьня іх.

А. МАНЬКОЎ.

Тварам да якасных паказальнікаў

Шпарлім тэмпам расьце сацыялістычная прамысловасьць БССР. З кожным днём уступаюць у строй новыя буйныя прадпрыемствы. Пытаньне «хто каго» ў прамысловасьці вырашана канчаткова і беспаваротна на карысьць пралетарыяту.

Прамысловасьць БССР у мінулым годзе значна **перавысіла заданьне другога году пяцігодкі.** Валавая прадукцыя на рэспубліканскай прамысловасьці ВСНГ БССР за 1930 год дайшла да 246,5 млн. руб. і ў 1931 г. запраектавана ў суме 433,5 млн. руб., як відаць, узрастаючы на 75,9 проц.

Адначасова з гэтым растуць капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць. Калі ў 1930 г. на пляне падлягаў укладаньням 41 млн. руб., дык у 1931 г. укладаньні яшчэ больш растуць, складаючы 61 млн. руб.

Аднак, калі ў галіне колькасных паказальнікаў мы ўсе гады мелі няўхільны рост, становішча з якаснымі паказальнікамі наглядаецца іншае. Нават першыя месяцы 1931 году выклікаюць вельмі сур'ёзныя апасні за выкананьне прамфінпляну і з усёй відавочнасьцю сыгналізуюць аб значным прарыве, які намячаецца.

Трэба наогул адзначыць, што пытаньне якасных паказальнікаў набывае зараз надзвычай важную ролю. Выкананьне пляну зараз абумаўляецца ня толькі дасягненьнем колькасных паказальнікаў, але і якасных і наадварот.

Якасныя паказальнікі за студзень і люты месяцы г. г. сыгналізуюць аб намячэньні прарыву, аб неабходнасьці безадкладнай дапамогі, мабілізацыі ўвагі ўсіх прадпрыемстваў, грамадзкасьці і друку вакол гэтых пытаньняў.

Зьніжэньне сабекошту—важнейшае зьвяно ў выкананьні праграм

Асабліва востра гэта адчуваецца ў пытаньні **зьніжэньня сабекошту**—гэтага важнейшага фактару ў выкананьні народна-гаспадарчага пляну. Даныя за студзень і люты месяцы г. г. з усёй выразнасьцю ілюструюць гэта становішча. На асобных прадпрыемствах галіновых аб'яднаньняў ВСНГ БССР зьмены ў сабекошце адлюстроўваюцца ў наступнай табліцы:

Галіна прамысловасьці і назва прадпрыемства	На пляне на 1 квартал	Фактычна выкананa за два месяцы
1. Шкляная		
Гута «Кастрычнік»	—15,9	+7,8
» «Ноўка»	— 7,0	+20,6
» Пралетары»	— 0,9	+18,5
2. Гарбарная		
Гомельская гарбарня	—13,2	— 4,5
3. Абуткова я		
Менская абуткова ф-ка	— 7,4	— 0,4
4. Запалкавая		
Запалкова ф-ка «Дняпро»	— 9,4	+12,5
» «Х Кастрычнік»	— 6,3	+ 8,7
» «Возуві»	— 9,7	+ 8,2
5. Фанэрная		
Фанэрны завод «Возуві»	— 2	+ 6,9
» » «Дняпро»	— 2	+21,6
6. Хэмічная		
«Чырвоны хэмік»	— 3,5	+ 6,9

Як відаць з прыведзеных лічбаў, прамфінпляну 1931 году з боку зьніжэньня сабекошту пагражае разьлад і правал. Пытаньне зьніжэньня сабекошту яшчэ не атрымала належнага месца ў агульнай барацьбе за плян. Кожны процант зьніжэньня сабекошту ў 1931 г. ласьцю 100—180 млн. руб. эканомі. Прыведзеныя-ж лічбы не паказваюць патрэбнай упартасьці ў барацьбе за кожны рубель сацыялістычнага накапленьня. На практыцы наглядаецца недастаткова высокая увага пытаньням сабекошту, спазьненьне ад сапраўдных, аб'ектыўна добразычэсных, дапамогі і кіраўніцтва, спазьненьне да ўсіх складаных, ня адзіных, пытаньняў і г. д. Трэба з усёй адпаведнасьцю дзяўчыць, што даныя калькуляцыі яшчэ **ня сталі дапаможнікамі пашым гаспадарнікам у іх штодзённай рабоце.** Калькуляцыя, як і раней, стаіць на задворках нашага ўліку Але-ж даныя, якія ўскрываюцца ёю, заслугоўваюць самай сур'ёзнай увагі.

З боку частак гаспадарнікаў зараз стала вельмі модным спасылка на аб'ектыўную прычыну—адсутнасьць ці недахват сырцу. Аднак, калі гэта будзе адпавядаць сапраўднасьці для такіх галін прамысловасьці, як мэталёвая, шкляная і запалкавая, дык для іншых, паказаных у табліцы, гэта будзе бязумоўна жаданьнем апраўдацца. Галіны-ж прамысловасьці, якія працуюць на мясцовым сырцы—напрыклад, гарбарная фанэрная, хэмічная і іншыя, могуц ня мець ніякіх адносін да пытаньня вострасьці становішча з сырцом. Нават на тых прадпрыемствах, дзе перабоі з сырцом асабліва востра адчуваліся, **ня ўсе магчымасьці былі мабілізаваны да эканомнага скарыстаньня.** Частыя выпадкі, калі на адзінку прадукцыі ішло больш сырцу, чым гэта запраектавана ў вытворчых праграмах. Напрыклад, выдаткаваньне сырцу на адзінку прадукцыі на асобных прадпрыемствах розных галін прамысловасьці, параўнальна з выдаткаваньнем яго, запраектаваным у плане, дае значнае адхіленьне ў бок **павялічэньня** яго.

Прадпрыемствы	Паказальнікі	Люты 1931 г. у проц. да лютага 1930 г.	Люты 1931 г. у проц. да пляну
Фанэрны завод «Возуві»	Выдатак алешыны на 1 к. м. фанэры	128,8	129,4
Запалкавая фабрыка «Возуві»	Выдатак асіны на скрынку запалак	105,7	123,1
Віцебская гарбарня	Выдатак тонкаў кар'ювых	197,8	156,8
Рымарная фабрыка	Выдатак сырамяціны на 100 хамутоў	109,0	132,0

Як відаць з гэтых далёка няпоўных даных, выдаткаваньне сырцу расьце ня толькі параўнальна з паказальнікамі пляну, але нават і ў параўнаньні з мінулым годам. На радзе іншых галін прамысловасьці ў некаторых выпадках таксама наглядаецца аналёгічнае становішча.

Адначасова з гэтым на частцы прадпрыемстваў растуць: **выдатак рабсілы і прастой абсталяваньня** як у параўнаньні з планам, так і мінулым годам.

Ня гледячы на надзвычайную вострасьць становішча з апалам, выдаткаваньне яго да гэтага часу па радзе прадпрыемстваў застаецца зусім неэканомным і перавышаючым плян. Перапальваньне апалу на частцы прадпрыемстваў наглядаецца, як звычайнае зьявішча.

На барацьбу з бракам, за высокую якасьць прадукцыі

Брак прадукцыі пачынае надзвычай расьці, дасягаючы на паасобных прадпрыемствах «рэкордных» лічбы. Гэта асабліва выразна адбіваецца ў наступных даных:

Прадпрыемствы	Паказальнікі	Студзень 1931 г. у проц. да студз. 1930 г.	Студзень 1931 г. у проц. да пляну
Мэталязавод імя Варашылава	Брак на ліцьці (унутр.)	—	200,0
Гута «Ноўка»	Проц. бою браку лямпав. шкла «Прыма»	159,3	300,0
» »	Проц. бою лямп. шкла экспарт.	152,9	227,1
» «Ільліч»	Проц. браку манапольн. начышня	127,3	373,3
» »	Проц. бр. аптэчнага начышня	137,8	206,7
Запалкавая ф-ка «Бярозіна»	Брак на 1 скр. запал.	190,8	216,8
» » «Возуві»	» » » »	330,1	542,2
» » «Дняпро»	» » » »	259,2	386,2

Як відаць з прыведзеных лічбаў, на браку наглядаюцца значныя прарывы на асноўных галінах нашай прамысловасьці. Прыведзеныя нават няпоўныя даныя настойліва сыгналізуюць аб неабходнасьці прыняцьця безадкладных і рашучых мер. Пытаньні штодзённай крапотлівай барацьбы за плян, за сацыялістычную тэхніку і яе аўладаньне разгортваюцца перад кожным гаспадарнікам ва ўсю шырыню. Яны патрабуюць безадкладнага пераходу да сапраўднай дэтальнай працы ў гэтай галіне. Яны завастраюць неабходнасьць перабудовы працы ў адзіненасьці з гэтымі надзвычай важнымі заданьнямі. Плян 1931 году патрабуе **мабілізацыі ўсіх магчымасьцяй** сацыялістычнага градпрыемства. Аднак, трэба сказаць, што такога пералому яшчэ не наступіла. **Наяўныя скрытыя рэзэрвы яшчэ не мабілізаваны.**

Да гэтага часу пытаньні **якасьці прадукцыі,** барацьба з бракам, рацыяналізацыя слаба адчуваюцца ў штодзённай

Рацыяналізатарскую работу—на вышэйшую ступень

Ня гледячы на тое, што ў 1931 г. прамысловасьць БССР павінна правесьці **зьніжэньне сабекошту,** якое складаецца **на 50 проц. за лік рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў,** становішча, якое наглядаецца зараз, ня можа лічыцца здавальняючым.

Як адзначыў прэзыдыум ВСНГ БССР (10 красавіка г. г.), **справе сацыялістычнай рацыяналізацыі ў прамысловасьці БССР, як адзэй з галоўнейшых прадпасылак у выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну, зьніжэньні сабекошту і перабудове гаспадаркі на больш высокай арганізацыйна-тэхнічнай базе, не аддавалася належнай увагі з боку гаспадарнікаў і грамадзкіх арганізацый прамысловасьці.** Ня ўсюды і да гэтага часу праведзена паспартызацыя абсталяваньня, не вядзецца ўліку загрузкі і таксама няма ўліку абсталяваньня, якое не скарыстоўваецца.

Сацыялістычны абмен вопытам паміж прадпрыемствамі не знаходзіць патрэбнага ахвятку ў практыцы прамысловасьці БССР. Па радзе прадпрыемстваў карткі «СО» (сацыялістычны абмен вопытам) не запаўняюцца і не распаўсюджваюцца сярод рабочых.

Наогул да гэтага часу такія важныя пытаньні, як **перавод прадпрыемстваў на гаспадарчы разрахунак, барацьба са стратамі,** мэханізацыя паасобных працэсаў, унутрыцэхавае і міжцэхавае плянаваньне, аналіз калькуляцыі—не знаходзяць па большасьці прадпрыемстваў штодзённага сыстэматычнага вывучэньня, адпаведнага скарыстаньня і замацаваньня наяўных посьпехаў.

Начныя зьмены адстаюць ад агульных тэмпаў работы

У прыватнасьці асабліва мала яшчэ зроблена ў галіне адпаведнай арганізацыі і абслугоўваньня начных зьмен. Да гэтага часу вельмі пашыран «погляд», што прадукцыйнасьць працы ў значнай меры павінна зьнізацца ў другой і трэцяй зьмене.

Аднак, як паказаў рад абсьледваньняў прадпрыемстваў, прадукцыйнасьць працы залежыць ад адпаведнай арганізацыі вытворчасьці, ад тэхнічнага кіраўніцтва і належнага абслугоўваньня начных зьмен. Абсьледваньне нават паказала, што магчыма арганізацыя начных зьмен, пры якой прадукцыйнасьць працы **вышэй,** чым дзённая.

Вось некалькі прыкладаў з абсьледваньняў брыгад ЦК УсКП(б), праведзеных тав. Дубпэрам у газэце «За індустрыялізацыю».

Завод «Серп і молат»—Масква. Наўгадзінная выпрацоўка ў арэуша-пракатным цэху за верасень 1930 году: у першую зьмену—100 проц. (ад 6 гадз. раніцы да 12 гадзін дня

8 млн. руб. недапаступіла ў дзяржаўныя касы

такі вынік мабілізацыі сродкаў за красавік

Прарывы ў пачатку другога кварталу ствараюць пагрозу выкананьню фінпляну трэцяга рашаючага году

Вывесьці фінработу за сьцены канцылярый.—Акружыць фінорганы пільчай увагай савецкай грамадзкасьці. —перабудаваць фінработу на базе мабілізацыі мас на барацьбу за фінплян

Ліквідаваць пагрозу фінансаваньня народнай гаспадаркі

Фінплян трэцяга рашаючага году мае выключна важнае палітычна-гаспадарчае значэньне ў справе стварэньня фінансавай базы для завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Барацьба за фінплян ёсьць неадлучная частка барацьбы за пяцігодку ў чатыры гады. Таму пытаньню выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў павінна быць аддана ўся ўвага ўсіх савецкіх, партыйных, прафсыяльных і інш. арганізацый. Недаацэнка мабілізацыі сродкаў сьведчыць аб апартуністычных адносінах да аднэй з важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Даныя аб выкананьні фінпляну за красавік—першы месяц другога кварталу трэцяга рашаючага году—гавораць аб тым, што АПАРТУНІСТЫЧНАЯ НЕДААЦЭНКА ФІНРАБОТЫ ЯШЧЭ НЕ ЛІКВІДАВАНА і ДАЕ АБ САБЕ ВЕДАЦЬ.

ФІНАНСАВЫ ПЛЯН ДРУГОГА КВАРТАЛУ ВЫКАНАН ДАГЭТУЛЬ ТОЛЬКІ НА 22,1 ПРОЦ. МЕСЯЧНЫ ПЛЯН ЗА КРАСАВІК ВЫКАНАН НА 46,4 ПРОЦ. ГЭТЫЯ ВЫНІКІ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА ЛІЧЫЦЬ ЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМІ.

Прарыў па лініі ўцягненьня ўкладаў у ашчадкасы не ліквідаваны. Фінплян па ашчадкасах за красавік выкананы толькі ў разьмеры 34.5 проц.

Спажывецкая каапэрацыя асабліва на вёсцы не прыняла рашучых мер для ўзмацненьня паянакапленьня: месячны плян выкананы на 29,6 проц., квартальны—на 13,3 проц.

Заданьне па культзборы ажыцьцёўлена толькі на 33,4 проц.

Дрэнны ход мабілізацыі сродкаў стварае пагрозу бесьперабойнаму фінансаваньню народнай гаспадаркі. Павінны быць прыняты самыя баявыя, самыя энэргічныя меры для ліквідацыі прарыву ў выкананьні фінпляну.

Спажывецкая каапэрацыя ня выконвае сваіх абавязацельстваў

Прайшло шмат часу з таго моманту, калі **«Зьвязда» ўзяла на грамадзкі буксір работу спажывецкай каапэрацыі па мабілізацыі сродкаў насельніцтва.** У адказ на выклік «Зьвязды», Белкаапсаюз абвясьціў усю спажывецкую сыстэму мабілізаванай для ліквідацыі прарыву і абяцаў прыняць самыя баявыя меры, каб **выканаць фінплян спажывецкай сыстэмы.**

Трэба адзначыць, што спажывецкая каапэрацыя, дабіўшыся на працягу апошніх дзён першага кварталу некаторых посьпехаў у мабілізацыі сродкаў, гэтых посьпехаў не замацавала, не разгарнула бальшавіцкай барацьбы за фінплян.

Аб гэтым сьведчаць вынікі мабілізацыі сродкаў за красавік г. г. Так, напрыклад, месячны плян паянакапленьня па вясковай сетцы выкананы ў разьмеры 29,6 проц., а квартальны—у разьмеры 13,3 проц., па гарадзкой каапэрацыі,—адпаведна,—на 70,5 проц. і 31,7 проц.

Плян паянакапленьня за першы квартал 1931 г. быў вызначаны ў суме 6.700.000 руб., фактычна сабрана 3.600.000, што складае 61 проц.

Недавыкананьне ідзе, галоўным чынам, за лік сельскай сеткі. Адзначаецца слабае выкананьне агульнага пляну мабілізацыі сродкаў па спажывецкай сыстэме за другі квартал—першая дэкада красавіка дала 13,5 проц. месячнага пляну.

Таварныя рэшткі на вёсцы, паводле апошніх даных НКФ, перавышаюць плянавыя рэшткі на 78,4 проц. (замест 10.500.000—18.800.000 р.), а па гарадох—на 30 проц. Плян тавараабароту за першы квартал выкананы толькі на 87 проц.

Весткі з месц стракацяць данымі аб парушэньні арганізацыямі спажывецкай каапэрацыі дырэктыў аб мабілізацыі сродкаў. Вось, напрыклад, **Гарадоцкі** райспажыўсаюз увесь час ня выконваў пляну паянакапленьня і заўсёды перавышаў ліміты. Плянавая астача тавараў была перавышана ў два разы. Калі Дзяржбанк закрыў райспажыўсаюзу ліміты, ён усю выручку—каля 6 тыс. руб.—ня здаў у банк, а выдаў, у якасьці зарплаты, сваім работнікам.

Дрысенская спажыўтаварыства амаль у тры разы перавысіла рэштку тавараў, вызначаную, паводле пляну. Замест ліміту ў 70 тыс. руб., таварыства мае запазычанасьць у 234 тыс. руб. Старшыня таварыства т. **Баравік** спакойна вылае кліентам чэкі на Дзяржбанк, а на бягучым рахунку яго нічога няма. Кліенты хвалююцца, крычаць, што ў Дзяржбанку пазнае бюракратызм і блытаніна, а Баравік зусім спакойны, яго «хата з краю».

Такі-жа малюнак на **Касьцюковіцкім** раёне. Касьцюковіцкае сельскае таварыства за першую дэкаду красавіка сабрала 50 руб. паёў. На складах раённай каапэрацыі ляжаць тавары на 250.000 руб., замест 95.000 руб. па пляне; усе тавары ходкія—вопратка, абутак, галантарэя.

Гэтыя даныя сыгналізуюць аб тым, што спажывецкая сыстэма не перабудавала сваёй фінансавай работы, што работнікі каапэрацыі апартуністычна недаацэньваюць мабілізацыі сродкаў і ўпарта ігнаруюць адпаведныя дырэктывы. **Гэтаму зьявішчу павінен быць неадкладна паложан канец.**

Хто едзе на тыраж ад БССР

ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў ДРУГІМ ТЫРАЖЫ ПАЗЫКІ «ПЯЦІГОДКА—ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ» БССР АТРЫМАЛА ДВА МЕСЦЫ. АДНО З ІХ ДАНА ВІЦЕБСКУ, АДКУЛЬ ПАЕДЗЕ РАБОЧЫ ЗАВОДУ «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ» І АДНО КЛІМАВІЧАМ, АДКУЛЬ ПАСЫЛАЕЦЦА ПРАДСТАЎНІК КАЛГАСУ «БАЛЬШАВІК» БЕЛАРУСІ», ЯКІ НАЛІЧВАЕ 480 ГАСПАДАРАК.

ТАВАРЫШЫ, ЯКІЯ ПРЫМУЦЬ УДЗЕЛ У ТЫРАЖЫ, ПАВІННЫ ЗЬЯВІЦЦА АКТЫВІСТАМІ Ў РАБОЦЕ ПА ДЗЯРЖКРЭДЫТУ; ЯНЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ Ў ДАЛЕЙШЫМ СКАРЫСТАНЫ У ЯКАСЬЦІ ГРАМАДЗКІХ ІНСТРУКТАРОЎ ПА ДЗЯРЖКРЭДЫЦЬЕ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ І Ў КАЛГАСАХ.

В-г.

Шэфы асаавіяхэмаўцы у чырвонаармеўцаў

Перад 2-м тыражом

пазыкі „Пяцігодка—за 4 гады"

25-га мая ў г. Макеёўцы (Данбас) адбудзецца другі тыраж пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады», у якім прымуць удзел і трымальнікі аблігацый трэцяй пазыкі індустрыялізацыі.

Даныя аб ходзе рэалізацыі пазыкі па БССР гавораць аб тым, што за апошнія месяцы тэмпы падпісной кампаніі значна зьнізіліся, што, як і раней, існуе вялікі разрыў паміж рэалізацыяй і ўзносамі грошай па пазыцы.

Кантрольная лічба рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» выканана на 93,9 проц. У той час, як рабочыя і служачыя падпісаліся на 111,9 проц. заданьня, сярод сялян рэалізавана толькі 55 проц. Вёска, як і раней, застаецца самым адсталым вучасткам, самым «вузкім» месцам рэалізацыі. Прычына—У СЛАБОЙ УВАЗЕ ДА ПАДПІСНОЙ КАМПАНІІ З БОКУ РАЁННЫХ І ВЯСКОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, У ДРЭННАЙ РАБОЦЕ ФІНАНСАВА-КРЭДЫТНАГА АПАРАТУ НА МЯСПОХ.

Трэба адзначыць, што афармлено на ўся рэалізаваная сума—афармленьне дасягае 99 проц.

За першы квартал г. г. ў касы Дзяржбанку недапаступіла 3.600.000 руб., або 59,7 проц. вызначанай плянам сумы рэалізацыі.

Невыкананьне пляну паступленьняў сум па пазыцы тлумачыцца дрэннай рэалізацыяй пазыкі па сялянскім сэктары і затрыманьнем грошай у калектывах (па гарадох паступіла 79,5 проц. сумы рэалізацыі).

За красавік павінна было паступіць 3.900.000 руб., паступіла 1.658.000 руб., ці 42 проц. пляну касавых паступленьняў. Ад калектываў рабочых і служачых паступіла 56,3 проц., вызначанага пляну, ад сялянскага сэктару—толькі 20,4 проц.

Час, які застаўся да пачатку тыражу, павінен быць шырока скарыстаны для правядзеньня масавай работы вакол пазыкі.

Новы дом для рабочых у Гомелі на 55 кватэр

Пленум праўленьня БелАПП'у

12-га мая адкрываецца пленум праўленьня Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў. Пленум будзе працаваць тры дні. У парадку дня пленуму наступныя пытаньні: **палітычны даклад** (дакладчык тав. **Будзінскі**); **справаздача сакратарыяту** БелАПП'у (дакладчык тав. **Ліманоўскі**); **творчая дыскусія ў РАПП'е** (дакладчык - прадстаўнік **РАПП'у**); **творчыя пытаньні** (дакладчыкі: т. т. **Гальперына, Бэндэ, Аляхновіч і Бранштэйн**); **арганізацыйныя пытаньні.**

У рабоце пленуму прымуць удзел прадстаўнікі ВОАПП'у, РАПП'у, ВУСПП'у, ЗАКАПП'у, рабочыя ўдарнікі, прадстаўнікі **менскай, бабруйскай, гомельскай, віцебскай і полацкай філій і** прадстаўнікі літтурткоў **Барысава, Слуцку, Магілева, Горак і Воршы.** На пленум запрошаны прадстаўнікі менскай і бабруйскай сэкцыі **БелАЧАФ'у.**

АДОЗВУ РАБОЧЫХ „ДЗЬВІНЫ" І АРШАНСКАГА ІЛЬНАКАМБІНАТУ

давесьці да шырокіх мас здатчыкаў ільнавалакна

Дагэтуль вакол закліку тэкстыльшчыкаў не мабілізаваны масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў

Тэмпы загатовак ільну злачынна нізкія—на 1 мая загатоўлена 40.7 проц. пляну

Член Вендараскага сельсавету (Маілейшчына) тав. РАДОЎСКІ, здолеўшы зуртаваць масы здатчыкаў вакол адозвы „Дзьвіны", дабіўся вялікіх посьпехаў у загатоўках. Пачын тав. Радоўскага павінен быць падхоплены ўсімі раёнамі БССР

Усе тэрміны даўно прашлі

Усе тэрміны выкананьня плянаў ільна-загатовак даўно прайшлі. Ня гледзячы на рад выразных дырэктыў вышэйшых органаў, шматлікія сыгналы друку, пляны загатовак ільна-валакна, пянькі, ільна-насеньня ня выкананы. Здача ільну зацягваецца, што наносіць вялікую шкоду народнай гаспадарцы.

БССР — адзін з асноўных ільнаводчых раёнаў. 24.000 тон ільна-валакна павінна атрымаць з палёў Беларусі тэкстыльная прамысловасьць. Між тым, Віцебская фабрыка «ДЗЬВІНА» і АРШАНСКІ ІЛЬНАКАМБІНАТ не забясьпечаны сырцом, што пагражае выкананьню вытворчых заданьняў.

Тэмпы ільназагатовак сапраўды чарапашыя. У зьвязку з «палітыкай паблажак» кулаку у паасобных раёнах, апартуністычнай недаацэнкай ільназагатовак, дэмабілізацыйнымі настроямі месц, няўменьнем увязаць ільназагатоўкі з правядзеньнем кантрактацыі і веснавой сяўбы, ГАДАВЫ ПЛЯН ЗАГАТОВАК ІЛЬНА-ВАЛАКНА ВЫКАНАН НА 1-га МАЯ НА 40,7 ПРОЦ. На 25 красавіка было загатоўлена 40,5 проц., на 20—40,3 проц. Такім чынам, кожную пяцідзеўку тэмпы нарастаюць на 0,2 ПРОЦ. Гэта мізэрная лічба — 0,2 проц. — як быццам узаконена і нашы загатоўчыя арганізацыі зусім ня трывожацца аб тым, што, калі гэтыя тэмпы ня будуць паскораны, загатоўкі зацягнуцца на доўгія месяцы.

Ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы партыі і ўраду, на рашучыя меры, прынятыя ў адносінах зрыўшчыкаў загатовак, у некаторых раёнах крывая загатовак літаральна замерзла. МАЗЬІРСКІ раён «дабіўся»... 10 проц. выкананьня гадавога пляну, ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІ — 12,2, ЮРАВІЦКІ — 13,4 НАРАЎЛЯНСКІ — 11,7, СЬВІСЛАЦКІ—12,3. За такія «дасягненьні» трэба прыцягваць да самай суровай адказнасьці, ня спыняючыся перад адданьнем пад суд кіруючых раённых работнікаў.

Зразумела, зрыўшчыкі ільназагатовак імкнуцца апраўдаць сябе, знайсьці прычыны, на якія можна спасылацца: тут неўраджай, паводка, максымальная канцэнтрацыя сіл вакол пасеўнай кампаніі, адсутнасьць ільну ў гаспадарках, «адсутнасьць кулакоў» і г. д.

Прайшло шмат часу з таго дня, калі была апублікавана адозва рабочых фабрыкі «ДЗЬВІНА» і АРШАНСКАГА ІЛЬНАКАМБІНАТУ, якая завастрыла ўвагу калгасных і бядняцка-сераднякіх мас вёскі вакол ільназагатовак, якая патрабавала ад мясцовых арганізацый баявых мер для забесьпячэньня выкананьня вытворчых заданьняў тэкстыльнай прамысловасьці.

Трэба сказаць, што мясцовыя арганізацыі не падхапілі гэтага закліку. Райкалгассаюзы нічога не зрабілі для растлумачэньня адозвы сярод шырокіх мас калгасьнікаў. Раённыя арганізацыі і сельсаветы не абгаварвалі адозвы на сваіх пленумах, не мабілізавалі вакоп ня вясковага актыву.

Гэта сьведчыць аб яўнай апартуністычнай недаацэнцы ільназагатовак — важнейшага фактара разгортваньня тэкстыльнай прамысловасьці.

Наркамснаб, ня гледзячы на сыгналы «Зьвязды», на прад'яўлены яму абвінаваўчы акт, праводзіць сваяасаблівую «змову маўчаньня», не адказваючы на запытаньні савецкай грамадзкасьці. Тое-ж робяць цэнтральныя загатоўчыя арганізацыі.

Паўтараем, УСЕ ТЭРМІНЫ ДАЎНО ПРАЙШЛІ. Далейшае зацягваньне ільназагатовак пагражае выкананьню важнейшых гаспадарчых плянаў. Кожны нявыкананы процант загатовак наносіць вялікія страты сацыялістычнай прамысловасьці. Кожны, хто глядзіць на ільназагатоўкі скрозь апартуністычныя акуляры, аб'ектыўна дапамагае клясаваму ворагу.

Патрэбны самыя рашучыя, самыя жорсткія меры, каб фарсаваць тэмпы ільназагатовак, каб прымусіць раёны падцягнуцца і дабіцца поўнага выкананьня заданьня.

Дырэктывы партыі і ўраду павінны быць абавязкова выкананы. Самая суровая адказнасьць — за зрыў выкананьня гэтых дырэктыў!

Менш паловы заданьня

АСЬВЕЯ. (Наш кар.). У Асьвейскім раёне плян загатовак ільна-валакна выкананы на 1 мая на 42,1 проц., плян загатовак ільна-насеньня выкананы па лініі райкаапсаюзу на 48 проц., спажывецкай каапэрацыі — на 24. У зьвязку з адсутнасьцю масавай работы, калгасы адсталі ў ільназагатоўках, выкананьні гадавое заданьне па ільна-валакну на 50 проц.

Побач з калгасамі, якія паказваюць прыклады ўзорнай работы (калгас «Сейбіт» выканаў 94 проц. пляну, імя Рыкава — 82 проц., Канчанскі — 122), ёсьць калгасы, якія злачынна марудзяць са здачай ільну. Праўленьне калгасу «Чырвоны Ўсход», які здаў 13,6 проц. пляну, прыцягнута да адказнасьці.

Дрэнна ажыцьцяўляюцца дагавары па кантрактацыі ільну мінулага году. Усяго паступіла каля 56 проц. кантрактаванага ільна-валакна і 36 проц. ільнанасеньня. Спагнаньне ільнавалакна па цьвёрдых заданьнях далёка ня скончана, ня гледзячы на тое, што ўсе тэрміны ўжо прайшлі. Райкаапсаюз ня выконвае дыгэктыў наконт прыцягненьня да адказнасьці злосных зрыўшчыкаў ільназагатовак.

Прафсаюзныя арганізацыі стаяць у баку ад ільна-загатовак. На пашыраным пасяджэньні прэзыдыуму райпрафбюро было пастаноўлена мабілізаваць 10 чалавек для выезду ў сельсаветы. На інструкцыйнай нарадзе выяжджаючых зьявіўся адзін чалавек — прафсаюзы ня вылучылі людзей. **Прафарганізацыі Асьвейшчыны забыліся аб дырэктыве ЦСПСБ.**

М. В.

Ліквідаваць чарапашыя тэмпы

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Наш кар.). На Каменскім сельсавеце, Плешчаніцкага раёну, загатоўлена толькі 48.2 проц. заданьня па ільнавалакне.

Калгасы першыя адгукнуліся на заклік усебеларускага зьезду Саветаў — ударнымі тэмпамі разгарнуць загатоўкі: яны поўнасьцю выканалі заданьне па ільнавалакне. Кулацка-заможныя гаспадаркі сабатуюць здачу ільну, выканаўшы цьвёрдыя заданьні толькі на 66 проц. Сельсавет не прыцягнуў да адказнасьці тыя кулацкія гаспадаркі, якія ня здалі цьвёрдых заданьняў.

Чарапашыя тэмпы ў загатоўках ільну павінны быць неадкладна ліквідаваны.

А. Л.

ПАЧЫНАЕМ САМАПРАВЕРКІ ПЕРАБУДОВЫ ПРАФСАЮЗНАЙ РАБОТЫ

Правесьці яго, як масавую палітычную кампанію

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ

У сувязі з задачамі пасьпяховага разгортваньня калектывізацыі і сваячасовага завяршэньня пасеўнай кампаніі другой бальшавіцкай вясны, што патрабуе мабілізацыі ўсіх сіл, **скліканьне VII Усебеларускага зьезду прафсаюзаў—перанесьці на восень 1931 году. Таксама перанесьці на восень зьезд саюзу гарбароў, рэспубліканскую канфэрэнцыю працаўнікоў асьветы, лесдрэўрабочых і нарсуднікоў вязі.**

2. Накіраваць для дапамогі ў справе правядзеньня пасеўнай кампаніі 25 работнікаў з ЦП саюзаў і прэзыдыуму ЦСПСБ, пры чым, абавязаць т. т. выехаць на раёны не пазьней 9 мая г. г.

3. Прапанаваць ЦП саюзаў, Менскаму, Гомельскаму і Віцебскаму гарпрафсавету накіраваць саюзных работнікаў і членаў прэзыдыуму на пасеўную кампанію, паведаміўшы ЦСПСБ прозьвішчы вылучаных таварышоў і тэрмін аб'езду іх на пасеўную кампанію па месцы прызначэньня.

Усе таварышы, якія камандыруюцца, застаюцца прапаваць на раёнах да моманту адкліканьня іх ЦСПСБ. Усім выяжджаючых таварышом, зьявіцца з райпрафсаветамі і дапамагчы ім у справе перабудовы работы.

4. З 10 мая разгарнуць месячнік самаправеркі (паглыбленьня) перабудовы прафработы, ставячы аснову задачай месячніка: праверку перабудовы прафработы, перанясеньне ў цэх, групу, агрэгат, брыгаду, дапамогу перабудове ў перанесеньні ўсёй работы ў цэх, узаўшы як праграму дзеяньня адозву ЦСПСБ, дабіваючыся ў выніку месячніка ліквідацыі прарыву першага кварталу і выкананьня заданьняў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

5. Пераключыць усю работу па падрыхтоўцы да VII Усебеларускага зьезду прафсаюзаў на правядзеньне месячніка, **скарыстаўшы месячнік для ўцягненьня новых соцень тысяч ударнікаў да сапраўднага ўдзелу ў прафработе, да сапраўднага ўдзелу ва ўсім гаспадарча-палітычным жыцьці прадпрыемстваў.**

6. ЦП, ГПС, РПС і ФЗМК стварыць кіраводкія, цэхавыя, агрэгатныя, вучэбныя самаправерачныя брыгады, ставячы іх задачай—праверку і дапамогу перабудове.

7. Усю работу праводзіць мэтадам разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва паміж гарадамі, раёнамі, цэхамі і групамі. Дагаварыць паміж Менскам, Віцебскам і Гомелем (і там, дзе яны заключаць, пераключыць на лепшае кіраўніцтва, на лепшае правядзеньне месячніка, самаправеркі, асьвятляючы ўсю работу ў агульным друку, шматтыражках і ў сьценных газэтах, арганізуючы для гэтага рабкораўскія групы з асобных ударнікаў.

8. Прапанаваць ЦП камандыраваць адказных работнікаў у прамысловыя раёны Беларусі для канкрэтнай дапамогі і кіраўніцтва ў гэтай рабоце.

9. Надаючы выключнае палітычнае значэньне правядзеньню гэтай кампаніі і ўскладаючы ўсю адказнасьць на ГПС, прапанаваць ГПС прыкамандаваць да прадпрыемстваў членаў прэзыдыуму ці кіраўніцтва пізаямі вучэнкаў.

10. Праз 15 дзён заслухаць на прэзыдыуме даклад арг.-інструктарскага сэктару аб ходзе работы на месяцнік.

11. **Цэнтральны Савет Прафсаюзаў Беларусі заклікае ўсіх членаў саюзу, рабочых, ударнікаў, рабкораў і камсамольцаў прыняць актыўны ўдзел у месячніку праверкі прафработы, дабіваючыся перабудовы яе ў адпаведнасьці з пастановамі нашай партыі, дабіваючыся выкананьня плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі, дабіваючыся завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.**

Забыліся... аб прамфінпляне

(Гарбарня „Бальшавік", Менск)

Заводзк арганізацыі «Бальшавік» і ён-ж пасьля перавыбараў гарсавету прыступілі да наладжваньня жывой сувязі з гарсаветам, да мабілізацыі рабочых мас на дапамогу ў перабудове яго работы. Сярод рабочых была праведзена вялікая растлумачальная работа. У лютым была арганізавана дэпутацкая група з 7 чалавек і 2 кандыдатаў гарсавету. Праз кароткі час у гэту групу ўліліся яшчэ 51 рабочы гарбарні. Гэтыя рабочыя былі разьмеркаваны па 10 сэкцыях гарсавету.

Для работы на заводзе дэпутацкая група вылучае брыгады. Напрыклад, працавалі брыгады па паляпшэньні работы камісій садзейнасьці і ашчадкас. Брыгады выявілі і дапамаглі зьнішчыць цэлы рад недахопаў у рабоце гэтых арганізацый.

— «Свой 3-месячны плян мы ўжо выканалі за месяц», — заявіла старшыня гарсавету і дэпутацкай групы — тав. **Чыхамкіна.**

Здавалася-б, што ўсё добра. Адна, **у пляне работы групы дапушчан буйны недахоп, які неабходна зараз-жа выправіць.** Плян ахапіў рад бытавых пытаньняў (паляпшэньне работы сталоўкі, работа закрытага разьмерквальніка, правядзеньне равалюцыйных сьвят і інш.). **Але плян зусім не прадугледзіў пытаньня аб ролі дэпутацкай групы ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну.**

Аб разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва няма ніводнага слова.

Гэтую буйную намылку трэба зараз-жа выправіць.

М. Сакалоўскі.

НА ДАПАМОГУ ПАЦЯРПЕЎШЫМ АД ЗЯМЛЯТРАСЕНЬНЯ

Калектыў супрацоўнікаў БЕЛСАДГАРОДНІНЫ сабраў у карысьць пацярпеўшых ад зямлятрасеньня ў Закаўкаскай ССР 147 РУБ. і выклікае калектывы работнікаў НАРКАМСНАБУ і яго аб'яднаньняў: БЕЛМЯСА, БЕЛРЫБЫ, БЕЛПТУШКАПРАДУКТ, БЕЛШЧАЦІНЫ, БЕЛДЗЯРЖГАНДЛЮ і БЕЛСЕЛЬПРАМАБ'ЯДНАНЬНЯ.

Прэзыдыум ЦК СЯЛЯНСКІХ ТАВАРЫСТВАЎ УЗАЕМАДАПАМОГІ ўносіць у фонд дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Закаўказкай ССР 500 РУБ. Прэзыдыум зьвярнуўся з пістом да ўсіх раённых, гарадзкіх і сельскіх камітэтаў узаемадапамогі аб здзяйсьненьні сваіх сродкаў пэўных сум у карысьць пацярпеўшых.

Калектыў работнікаў БЕЛКАЛГАС ЦЭНТРУ арганізаваў збор сродкаў на дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня. Сабрана ўжо 200 РУБ. Збор працягваецца. Калектыў выклікае пасьледаваць гэтаму прыкладу работнікаў ДОНКАЛГАСЬНІКА, БЕЛСЕЛЬБУДУ, ТРАКТАРАЦЭНТРУ, РАБАЧКОМ САЮЗУ МТС І БАТРАЦТВА МЕНСКАГА РАЁНУ.

Бухгальтар-хуліган Волін выключан з членаў саюзу

8 мая бухгалтар заводу «Камунар» **Волін** зьбіў загадчыка пададдзелу забесьпячэньня гаводу тав. **Кауфмана.** Апошні зьвярнуўся да Воліна з просьбай даць яму весткі аб здачы заводам мэталялому «Стальсбыту». Весткі патрэбны былі для заключэньня са «Стальсбытам» дагавору на далейшую пастаўку лому.

Воліну не спадабаўся тон тав. Кауфмана. Апошні, моў, не назваў яго «по имени и отечеству», за гэта Волін яго палаў лаяць. Калі Кауфман адказаў, што яго паступак ня варты работніка савецкага прадпрыемства, Волін з усёй сілай ударыў яго кулаком па твары.

На скліканым у сувязі з гэтым пасяджэньні заўкому выявілася, што за Волінам такія хуліганскія ўчынкі пагадзяцца ўжо не ў першыню. Аб яго работы на заводзе ён мае ўжо заўкому за падобныя ўчынкі тры вымовы і папярэджаньні.

Выявілась таксама, што Волін тармазіць работу па пераводзе цэху на падарчы разрахунак і заключэньне дагавору. Заўком пастанавіў **выключыць Воліна з членаў саюзу і паставіў пытаньне перад адміністрацыяй аб зьняцьці яго з работы.**

Справа аб Воліне перададзена цэнтральную камісію па чыстцы савецкага апарату. Акрамя таго, заўком прапанаваў прасіць РСІ тэрміновага прыняць работу бухгалтэрыі заводу.

Учора ва ўсіх цэхах адбыліся сходы рабочых, якія рашуча асудзілі ўчынкі Воліна і адналушна пазьбавілі Воліна членаў заукому.

Дайце сялітру для засолкі

ВУЛА. (ПА ТЭЛЕФОНУ). ПЛЯН МЯСАЗАГАТОВАК НА ВУЛЬСКІМ РАЁНЕ ВЫКАНАН НА 95 ПРОЦ. РАЗГОРТВАЕЦЦА ЗАСОЛКА МЯСА. ЗАДАНЬНЕ ЗАСАЛІЦЬ 200 ТОН З-ЗА АДСУТНАСЬЦІ СЯЛІТРЫ НЯ ВЫКОНВАЕЦЦА ПА. БЕЛКААПСАЮЗУ ПАСЛАНЫ ТЭЛЕГРАМЫ, АЛЕ СЯЛІТРА НЕ ДАСЛАЕЦЦА, І МЯСА ПАЧЫНАЕ ПАРАЦЦА. БЮРАКРАТАЎ ТРЭБА ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА АДКАЗВАСЬЦІ.

ЗІКУЛЬСКІ.

Паведамленьні

— Дом Камасьветы. 11 мая, у 8 гадз. веч., адбудзецца даклад т. **Выдра** на тэму: **«Твар нацдэмакратызму ў краязнаўстве».** Білеты па ячэйках і ў чытальні Дому.

— Менгарком КП(б)Б 12 мая, у 7 гадз. веч., у памяшк. залі пасяджэньняў гарному склікае нараду аб перабудове агіт.-масавай работы на прадпрыемствах. На нараду павінны зьявіцца кіраўнікі агіт.-масавых сэктараў партакалектываў, ячэек і цэх. ячэек КП(б)Б, а таксама жан. працаўнікі і заг. агітпропгабінэтаў.

— Дом Пісьменьніка. 10 мая, у 2 гадзіны,—пасяджэньне бюро МенАПП. Выклікаюцца ўсе брыгадзіры, што працуюць на заводах, і г. д. Арк. Моркаўка, Т. Паўлоўскі, Таўлай, Алесін.

— 11 мая, у 7 гадз. веч., у Доме Пісьменьніка,—агульны сход Менскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў. У парадку дня: 1) Даклад пра пленум БелАПП'у. 2) Выбары дэлегатаў на пленум і іншыя пытаньні. Прысутнасьць усіх членаў БелАПП'у абавязкова. Ня прысутныя белапаўцы будуць прыцягнуты да арганізацыйнай адказнасьці. Запрашаюцца рабочыя ўдарнікі, літтурткоўцы, студыйцы.

— Усебеларускі зьезд навуковых працаўнікоў, назначаны на 24 мая, адкладаецца. Аб тэрміне яго скліканьня будзе паведамлена дадаткова.

Папраўка

У зьмешчаную ў № 117 «Зьвязды» пастанову СНК БССР пра догляд пасеваў, уборачную і асенняю пасеўную кампанію трапілі памылкі.

У разьдзеле 3-м «Уборка і абмалот» у таблічцы надрукавана: «абмалот яравога збожжа да 15 лістапада у калгасах і да 15 лістапада у калгасах і 1 сьнежня у калгасах».

У разьдзеле IV-м «Падрыхтоўка сяўбы азімых» надрукавана: «у саўгасах—20 тыс. га, у калгасах—642 тыс. га», трэба: «у саўгасах 20 тыс. га, у калгасах—648 га».

У дуцыцу 18 гатага-ж разьдзелу надрукавана: «правесьці лучэньне і ачыстку ўсіх сеўных і пасадачных зярнятаў, абліва на плошчы 1.200 тыс. га», трэба чытаць: «правесьці лучэньне і ачыстку на плошчы 1.200 тыс. га».

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр
10 МАЯ паказ для друкарні імя Сталіна. Пач. у 8 гадз.
І. Гурскі **КАЧАГАРЫ** п'еса ў 4 дзеях.

„Чырвоная Зорка" Пач. 7. 8-45 і 10-30
З нядзелі, 10 мая. новы амэрыканскі прыгодніцкі фільм **У АПОШНЮЮ ХВІЛІНУ (Плывы, дзяўчына плывы)** У гал. ролі **Біб Даніэльс.** Зьвыш праграмы—хроніка Сэзокіно № 19. З 10-V **РЭВАНШ** Зьвыш праграмы хроніка № 20.

„Культура"

„Інтэрнацыянал" З 5 мая замежны фільм **ШЛЮБ аб ЗАКЛАД** Пач. 1 с. у 6 г. Каса—з 4 г. 30 м.

„Пралетарый" **МОНЦІ БЭНКС** у камэдыі **Гоншчык супроць волі**

„Юны Піянэр" Пач. з 1 г. дня. З 6 МАЯ Ўсходні фільм **АЛІМ** Кіно-аповесьць у 7 частках.

„СПАРТАК" Пач. 6-3, 8 і 9-30 Каса—з 5 гадз. З 2 па 10 мая выдатны фільм **АДЗІН З ДВАЦЦАЦІ** Драма ў 7 частках.

Дзяржаўнае аб'яднаньне музыкі, эстрады і цырковых прадпрыемстваў
МЕНСКІ ДЗЯРЖЦЫРК
Сёньня—адкрыцьцё летняга сэзону.
У праграме—лепшыя савецкія і замежныя атракцыёны
Стайня ў 25 мушторавачных коней пад кіраўн. вядомага муштроўшчыка **А. В. Лапідо.**
Солё—клёўн, мушторўшч. жывёлы **С. Шафрык.** | Паветраны палёт пад купалам цырку **4. Анчыванні 4.**
Морскіх спорт-акрабаты. **8 БЕЙО 8** | На дроце эквілібрысты. японскія артысты **НАІТО**
Замежныя артысты **КЛАТТ** і ПАРТНЭР. | Музычныя эксцэнтрыкі **Грыньяе і Мішэль.**
Глад акрабаты **4 МАРК** | Камічныя акрабаты **Трыо Гельман** | Клёўны сьмехатв. **Князіна і Анатолі**
Турністы **4 Гартвэльс** | Жанглёры на дроце **2 Мішэль** | Паветраная трапэцыя **Тэлчэнка**
Родлікабежцы **2 Брэндзі**
Каса адкрыта штодзённа з 12 гадз. дня да 10 гадз. вечара. Пачатак роўна ў 8 з палов. гадз. вечара.

Сёньня, ў 7 гадз. увечары ў памяшк. клюбу К. Маркса Гарконам КП(б)Б, Гапрафсаветам і Газбюро
СКЛІКАЕЦЦА
агульна-гарадзкая канфэрэнцыя
З ПАРАДКАМ ДНЯ:
1. Сацыялістычнае будаўніцтва і задачы друку.
2. Суздаклад Газбюро.
3. Вялікая мастацкая частка.
Яўка наступных т. т. абавязкова: ўпаўнаважаных па друку ячэек КП(б Б і партакалектываў, ячэек КСМ, культпрацаўнікоў і культкамісій фабрычных камітэтаў і мясцкомаў, рэдкалегій насьценных газэт і шматтыражак, рабкораў і ўдарнікаў.
Запрашаюцца прадстаўнікі рэдакцый цэнтральных газэт і выдавецтваў, сэкратары партчэйек і чыгачы партыйна-камсамольскага друку.
Білеты атрымаць у культпропе Гаркому.
Менгарком КП(б)Б. Гапрафсавет. Газбюро.
496.

Сёньня, 10 м. я. у 7 гадз. веч., у пазашпальні клюбу САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ (рог Энгельса і Камуністычнай)
склікаецца
нарада прафактыву г. Менску.
У парадку дня—даклад аб апошніх пастановах Ус. ЦСПС і ЦСПСБ (дакл. тав. **КАМЕНШТЭЙН**).
Прысутнасьць на нарадзе работнікаў ФЗМК, МК, культ. клюбных працаўнікоў і работнікаў ЦП саюзаў абавязкова.
Запрашаюцца добраахвотнікі.
Намечаныя па саюзных лініях на паказаны час пасяджэньні, нарады і сходы павінны быць перанесены на іншы тэрмін.
МЕНГАРПРАФСАВЕТ.
510

12 мая, у 3 гадз. веч., у пашыраным залі пасяджэньняў ЦСПСБ перад агульнай нарадай прафактыву
адбудзецца
**нарада старшынь ФЗМК і пр